Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
31 ЖНІЎНЯ 2019 г. СУБОТА № 165 (29032)

### УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

**Шчыра вітаю гасцей і ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства.**

**Святочную эстафету сёлета гасцінна прымае Слонім — адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі, які за сваё шматвяковае існаванне не аднойчы гераічна пераадольваў суровыя выпрабаванні. Ён захаваў гістарычныя карані і зараз гарманічна спалучае ў абліччы мінулае і сучаснасць.**

**Вялікая місія Дня пісьменства — аб'ядноўваць усіх беларусаў свету, перадаваць новым пакаленням літаратурныя і мастацкія скарбы нашага народа, любоў да матчынай мовы, выхоўваць беражлівыя адносіны да помнікаў даўніны, садзейнічаць умацаванню пачуцця гонару за Радзіму.**

**Гэта ўрачыстае свята займае пачэсную пазіцыю сярод важнейшых падзей культурнага жыцця краіны і з'яўляецца добрай нагодай яшчэ раз звярнуцца да спрадвечных нацыянальных традыцый і асэнсаваць іх месца ў цяперашнім часе.**

**Сардэчна жадаю ўсім новых цікавых сустрэч, плённай працы і творчага натхнення.**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# СЛОНІМ СВЯТКУЕ І ЗАПРАШАЕ!



Старажытны горад над Шчарай прымае XXVI Дзень беларускага пісьменства

Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«На сёння агульны ўзровень газіфікацыі прыродным і звадкаваным газам у краіне складае каля 97 %, агульная працягласць газатранспартнай сістэмы — каля 62 тысяч кіламетраў. Усе раённыя цэнтры і гарады цэнтралізавана забяспечаны прыродным газам. Спажыўцамі з'яўляюцца 3,7 мільёна бытавых абанентаў і прыкладна 15 тысяч арганізацый рэальнага сектара эканомікі. За першае паўгоддзе 2019 года газіфікавана прыродным газам 9,1 тысячы кватэр (у тым ліку ў сельскай мясцовасці — 2,4 тысячы), звадкаваным газам — 2,6 тысячы кватэр (2,1 тысячы ў сельскай мясцовасці). У 2018 годзе пастаўка прыроднага газу спажыўцам краіны склала 19,5 мільярда куб. м. На 2019 год пастаўка прыроднага газу запланавана ў аналагічных аб'ёмах».*

## КОРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў учора тэлефонную размову з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.

• **Месячная мінімальная заработная плата з 1 студзеня 2020 года складзе Br375.**

• Сярэднегадавая тэмпература паветра ў Беларусі з 1989 года павысілася на 1,3 градуса.

• **Сталіцай 65-га конкурсу песні «Еўрабачанне» стане Ратэрдам (Нідэрланды).**

Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:

# «Усё ў самай вялікай ступені залежыць ад ініцыятыўнасці і прафесіяналізму кожнага на сваім творчым участку»

**Сёння ў Слоніме і наваколлі распачынаюцца мерапрыемствы Дня беларускага пісьменства. Напярэдадні «Звязда» задала некалькі пытанняў з гэтай нагоды міністру інфармацыі нашай краіны Аляксандру КАРЛЮКЕВІЧУ.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**— Аляксандр Мікалаевіч, Дзень беларускага пісьменства будзе праходзіць у краіне ўжо дваццаць шосты раз. Некаторыя гарады, як, напрыклад, Полацк, былі сталіцай свята неаднойчы. Слонім прымае свята ўпершыню, і адбываецца гэта на фоне дзвюх знакавых у духоўным жыцці Беларусі дат, якія звязаныя са Слонімскай зямлёй, — 550-годдзя знаходжання іконы Маці Божай Жыровіцкай і 500-годдзя ўтварэння Жыровіцкага манастыра. Ці не атрымаецца так, што сёлета ўласна Дзень пісьменства адыдзе на другі план?**

— Па-першае, прыгожае пісьменства, пісьменства на землях славянскіх народаў — гэта як нідзе, пэўна, і тэма веры, тэма праваслаўя, тэма ролі Слова ў духоўным паяднанні народаў, у сімвалізацыі ўвогуле жыцця. Прыгадайце, з чаго, з якіх першадрукаў пачынаўся вопыт Францыска Скарыны. Звярніце ўвагу на ўзнаўленне, факсімільнае выданне Брэсцкай Біблії да юбілею аднаго са старажытных гарадоў нашай Айчыны — і відаць, у такім фармаце само пытанне адпадзе.

СТАР. 2

Дачны сезон

# БЕЗ СТАТУСУ ПАСЁЛКА

## Ці змогуць займець яго садоўніцкія таварыствы?

**Сёння многія садоўніцкія таварыствы ўсё больш нагадваюць невялікія вёскі з самавітымі жылымі дамамі. Прысядзібныя ўчасткі добраўпарадкаваны, тут ёсць свая разгорнутая інфраструктура з магазінамі і дзіцячымі пляцоўкамі. Жыхарам гэтых населеных пунктаў даводзіцца вырашаць розныя пытанні, звязаныя з маёмаснымі адносінамі, рэгістрацыяй або перарэгістрацыяй участкаў і нерухомасці, а таксама многія іншыя. На анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА гэтую тэму разгледзелі прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі і юстыцыі, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, Мінскага аблвыканкама і «Белэнерга».**

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

# «Усё ў самай вялікай ступені залежыць ад ініцыятыўнасці і прафесіяналізму...»



Фота БелТА.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

А па-другое, даты, пра якія вы згадалі, — гэта даты наступнага года. І мы, несумненна, прычынімся да падрыхтоўкі і святкавання 550-годдзя знаходжання іконы Маці Божай Жыровіцкай на Слонімскай зямлі і 500-годдзя ўтварэння Жыровіцкага манастыра. Дарэчы, прыадкрыю невялічкую таямніцу. Слонім сёлета якраз і стаў сталіцай Дня беларускага пісьменства па ініцыятыве ўрада краіны, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў у сувязі з тым, што 2020 год — год згаданых юбілеяў. А вось у 2019 годзе лагічна правесці мерапрыемства як агледзіны асветніцтва, духоўнасці ў гэтай староне.

**— Традыцыйны ўжо для свята круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» пройдзе гэтым разам у Жыровічах. Некаторыя яго ўдзельнікі — літаратары і літаратуразнаўцы больш з чым дзесяці краін — прыедуць не першы і нават не другі раз — круглы стол праводзіцца з 2007 года. Пытанне да Вас як да пастаяннага ўдзельніка гэтага мерапрыемства: адкуль бяруцца новыя тэмы для дыскусіі? Ці ў нейкіх момантах яна з году ў год паўтараецца?**

— Традыцыі і навацыі — заўсёдная тэма для разумнага спалучэння. Хіба не традыцыйным з'яўляецца пытанне пра ролю мастацкай літаратуры ў выхаванні грамадства, у сцвярджэнні гуманістычных ідэалаў развіцця? Канешне ж, традыцыйным. Але і пастаянным, вартым увагі не толькі з году ў год, але і са стагоддзя ў стагоддзе. На сёлетні круглы стол, які з'яўляецца творчым праектам не толькі Міністэрства інфармацыі, але і Саюза пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкага дома «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура», прыедуць пісьменнікі, літаратуразнаўцы з Азербайджана, Вялікабрытаніі, Грузіі, Індыі, Казахстана, Кітая, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны. Мы рады, што не першы раз прыязджаюць Святлана Ананьева з Казахстана і Глеб Кудрашоў з Украіны, Яронміас Лаўцюс з Літвы і Рысалат Хайдарава з Узбекістана, але мы рады і новым гасцям. Што цікава, менавіта ўдзельнікі «круглых сталоў» у розныя гады становяцца паўнамоцнымі прадстаўнікамі беларускай літаратуры, беларускай культуры, Беларусі ў сваіх краінах. Менавіта дзякуючы іх намаганням за апошнія дзесяць гадоў выйшлі анталогіі, зборнікі беларускай літаратуры, асобныя кнігі беларускіх аўтараў у перакладзе на іншыя мовы. Выбудавалася своеасаблівая замежная бібліятэка з кніг Максіма Багдановіча на славацкай, сербскай, таджыкскай мовах, Янкі Купалы, Якуба Коласа — на рускай, татарскай, чувашскай, балкарскай, узбекскай мовах, іншых класікаў і сучасных пісьменнікаў Беларусі.

**— Апошнім часам назіраецца добрая тэндэнцыя — па ўсёй краіне адкрываюцца новыя ці адноўленыя кнігарні. Слонім да свята таксама атрымаў такі падарунак з прыгожай назвай «Санет». Але каб кнігарня існавала, каб яна была запатрабаваная, асабліва ў невялікім горадзе, абнавіць інтэр'ер і нават асартымент недастаткова. Як вы лічыце, што яшчэ можа прывабіць чытача, спакушанага бясплатнымі кнігамі з Сеціва, прыйсці ў кніжны магазін ды яшчэ нешта ў ім набыць?**

— Толькі — прапагандай, актыўным «прасоўваннем» кніг і аўтараў. У тым ліку — і ў віртуальнай прасторы. Дарэчы, «Санет» працуе ў тэставым рэжыме з 15 чэрвеня. Ужо за гэтыя два з нечым месяцы прайшло досыць шмат прэзентацый, аўтограф-сесій. Былі і сустрэчы з аўтарамі, якія выраслі ці жывуць стала на Слонімшчыне, — Сяргеем Чыгрынам, Святланай Піронік. І што цікава, наўмысна, з разлікам на прэзентацыю, распаўсюджванне ў Слоніме, выдадзена нават некалькі кніг. Адна з іх — альбом рэпрадукцый старых паштовак, прысвечаных Слоніму, з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Другая — зборнік гістарычных нататак Сяргея Чыгрына пра слонімскія адметнасці. Не сумняваюся, што такая кніга будзе запатрабавана і ў школе.

**— Дарэчы, пра Сеціва. Можа, у Беларусі ўжо настаў час стварыць нейкі адмысловы партал, на якім усе ахвотныя маглі б пазнаёміцца з навінкамі ад айчынных пісьменнікаў, прачытаць трэйлер да новай кнігі, а зацікавіўшыся ёй, замовіць поўны варыянт (магчыма, не бясплатна)?**

— Тут бы і «Звяздзе» ініцыятыву праявіць. Найстарэйшая беларуская газета заўсёды была ўважлівая да беларускага прыгожага пісьменства. Многія мастацкія творы праз урыўкі прыходзілі першнаперш да чытача «Звязды». Што да электроннай, інтэрнэт-актыўнасці айчынных выдавецтваў, то цалкам згодзен, што без яе сёння не абысціся. І новыя ініцыятывы патрэбны як ніколі.

Дарэчы, звярніце ўвагу на сайт літаратурна-мастацкага часопіса «Маладосць». Нешматлікая рэдакцыя гэтага выдання ўмее і пра часопіс расказаць, і пра новых аўтараў, новыя праекты здольна «прапіярыць». Трэба вучыцца адно ў аднаго. Усё ў самай вялікай ступені залежыць ад ініцыятыўнасці і прафесіяналізму кожнага на сваім творчым участку. Іншых шляхоў для развіцця проста не існуе. Нават з вялікімі грашыма, з бюджэтнымі пасыламі можна спыніцца ў развіцці і застацца ў ранейшых дзесяцігоддзях.

**— Традыцыйным для Дня пісьменства становіцца ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Узнагароджвацца будуць пісьменнікі, якія працуюць тут і цяпер. А рэйтынгі продажаў кніг паказваюць, што ў пашане ў чытача больш класікі (за невялікімі такімі выключэннямі, як Наталля Батракова, напрыклад). Можа, лаўрэатам прэміі не хапае піяру?**

— Нацыянальная літаратурная прэмія — творчы праект, які пашырае сваю прастору. Ужо і сайт на гэтую тэму ёсць. Мяркую, што агульнымі намаганнямі з Саюзам пісьменнікаў Беларусі мы і надалей шмат што зробім для піяру, прапаганды гэтага праекта. Але заўважу, што Нацыянальная літаратурная прэмія праз дапамогу экспертаў у галіне літаратуразнаўства, у галіне практычнай работы па выданні літаратурна-мастацкай перыёдыкі ўсё ж з'яўляецца праектам, які заўважае ўсё новае, павінен заўважаць усё новае. І сама прэмія — гэта як адзін са сродкаў «раскруткі» таго ці іншага аўтара. Невыпадкова ўрад краіны па рэкамендацыі Саюза пісьменнікаў зацвердзіў і такую намінацыю для дэбютантаў, аўтараў першых кніг.

**— Як па-вашаму, за чвэрць стагоддзя існавання Дню беларускага пісьменства ўдалося стаць нацыянальным святам?**

— Мяркую, што ўдалося. І вельмі спадзяюся на яго даўгалецце і далейшае развіццё.

**Пытанні задавала**
**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# З МАЛІТВЫ ЗА ГОРАД І ЯГО ЖЫХАРОЎ

## пачнецца маштабнае святкаванне тройчы круглай даты

**Хто нядаўна вярнуўся ў горад з адпачынку, адразу заўважыў значныя перамены. Брэст расквеціўся сцягамі, стала больш яркіх фарбаў на вуліцах і фасадах будынкаў, з'явіўся асаблівы ўрачысты настрой, які бывае ў чаканні блізкай важнай падзеі. Пра будучае свята гавораць у сем'ях, ва ўстановах, у транспарце. Адным словам, абласны цэнтр гатовы сустрэць свой значны юбілей.**

На пляцы каля Вяслярнага канала прадстаўнікі замежнай фірмы ўжо тыдзень манціруюць галоўную сцэну міленіума. У горадзе шчыруе сталічная рэжысёрская група. **Рэжысёр-пастаноўшчык Марыя ТРАЦЦЯКОВА** расказала, што такой сцэны, шматфункцыянальнай і складанай, Беларусь яшчэ не бачыла: гэта не сцэна, а цэлы тэхнічны комплекс. Там прадугледжваецца некалькі сцэнічных узроўняў, у тым ліку з выкарыстаннем вады. Перад сцэнай будзе разгорнуты басейн з вадаспадамі, водны экран ды іншыя цікавінкі, якія павінны зрабіць заключнае шоу святкавання «Міленіум» не проста канцэртам, а нечым большым.

На адной сцэне, паводле праграмы, будзе знаходзіцца больш за 600 чалавек: музыканты, танцоры, акрабаты. Масавыя пастаноўкі пакажуць станаўленне і развіццё горада ад сярэднявечча да нашых дзён. Гэта амаль усе падрабязнасці, якія паведамляюць арганізатары, астатняе захоўваецца ў тайне, бо павінна ж мець інтрыгу такая грандыёзная дзея. Таму рэпетыцыі праходзяць не на месцы выступленняў, а ў памяшканні футбольнага манежа.

Вядома, што да ўдзелу ў двухгадзіннай феерыі прыцягнута вялікая колькасць харэаграфічных калектываў, у тым ліку найлепшыя культурныя сілы самога Брэста. Трэба спадзявацца, што шоу стане надзвычай відовішчным і запамінальным. Але названае мерапрыемства запланавана як фінальная кропка ў вялікай праграме трохдзённых святкаванняў. Усяго ж гэтых падзей будзе больш за сотню. І многія з іх абяцаюць стаць асабліва цікавымі, відовішчнымі, змястоўнымі.

Пачнуцца юбілейныя мерапрыемствы апоўдні 6 верасня ўрачыста-святочным прадстаўленнем, прысвечаным пачатку святкавання 1000-годдзя Брэста на плошчы Леніна. А ў сем вечара на гэтым месцы адбудзецца канцэрт «Горад святла». **Загадчыца сектара культуры Брэсцкага гарвыканкама Святлана СЯМАШКА** паведаміла, што на ім выступяць як беларускія, так і замежныя зоркі. Чакаецца выступленне Джо Цёрнэра, Ісайі, былога брастаўчаніна Сашы Ісаева ды іншых. «Горад святла» абяцае зацікавіць маладых.

Тым часам з вуліцы Гогаля пачнецца міжнародны парад аркестраў краін СНД «Марш 1000-годдзя». У Брэст на святкаванні прыедуць 10 аркестраў з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Ніжняга Ноўгарада, Нур-Султана, іншых гарадоў. Яны дадуць сольныя канцэрты, а таксама паўдзельнічаюць у парадзе і гала-канцэрце. Напрыклад, у 18 гадзін 6 верасня на вуліцы Савецкай сваю праграму пакажа аркестр штаба Паўночна-Заходняй акругі войск нацыянальнай гвардыі Расійскай Федэрацыі, а ў 19 гадзін пачнецца канцэрт аркестра Маскоўскага кадэцкага музычнага корпуса. Пройдуць канцэрты ў Брэсцкай крэпасці і на іншых пляцоўках горада. А ў 15 гадзін 7 верасня на скрыжаванні праспекта Машэрава і вуліцы Леніна пачнецца маляўнічы карнавал. Яго праграму ўпрыгожаць музыкай беларускія і замежныя аркестры. У гэты ж дзень у 15.30 пачнецца гала-канцэрт. Зводны аркестр з 400 музыкантаў адкрые яго ўрачыстай фанфарай Тысячагоддзя, напісанай спецыяльна для гэтага мерапрыемства (аўтар твора Алег Галубец з Гродна).

— Цяпер поўным ходам ідзе падрыхтоўка зводнага аркестра, — расказаў **кіраўнік Брэсцкага гарадскога духавога аркестра Валерый КОВАЛЬ.** — Важна адпрацаваць кожны крок: выхад, пастраенне і само выступленне.


Моладзь піша пажаданні на святочным банеры.
Фота БелТА.

Наогул жа мерапрыемстваў у афішы шмат, запланаваны шэраг фестываляў, асобных свят, такіх як Міжнародны дзіцячы фестываль тэатраў і кніг. Ён, дарэчы, пройдзе ў новым тэатры лялек, які толькі што здадзены ў эксплуатацыю і з'яўляецца адным са шматлікіх аб'ектаў тысячагоддзя. Гэтыя аб'екты — масты, дарогі — пабудаваны і абноўлены за грошы, якія краіна выдзеліла пад значны юбілей, і праслужаць гораду яшчэ многія дзесяцігоддзі — галоўнае, каб было мірнае неба ды здароўе і сілы ў гараджан для далейшай работы на карысць горада. Таму вельмі лагічным выглядае пачынаць святкаванне з малітвы. Усе канфесіі падрыхтавалі сваю духоўную праграму на святочныя дні. Боская літургія і падзячны малебен у памяць 1000-годдзя Брэста пройдуць ва ўсіх праваслаўных храмах, адслужаць месу і ўзнясуць малітвы за горад і гараджан католікі, памоляцца ў сваіх святынях прадстаўнікі іншых канфесій. Званы цэркваў і касцёлаў у гэты дзень будуць абвяшчаць велічны юбілей горада.

Брэст чакае вельмі многа гасцей. У гасцініцах ужо забраніраваныя фактычна ўсе нумары. Турапэратары абвясцілі, што амаль не застаецца месцаў у хостэлах, разабралі турысты і бюджэтныя кватэры. Гасцям застаецца шукаць знаёмых, сяброў. Думаю, у гэтыя дні амаль кожная брэсцкая сям'я будзе рада прыняць гасцей: сваякоў, сяброў, знаёмых ці нават знаёмых сяброў. Так што чакаем свята!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БЕЗ СТАТУСУ ПАСЁЛКА


Фота Віктара МІРОНЧЫКА.

## Ні вёска, ні аграгарадок

**Намеснік начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Марына АСТАПЕНКА** нагадала, што пытанне надання садоўніцкім таварыствам статусу жылых пасёлкаў разглядалася яшчэ ў 2013—2014 гадах. Але яно засталося нявырашаным, бо большасць таварыстваў у нас не адпавядаюць патрабаванням, што прад'яўляюцца да населеных пунктаў (у іх меншая шырыня дарог, некарэктнае размяшчэнне пабудоў). Хтосьці выкарыстоўвае зямельны ўчастак толькі для вырошчвання сельгаспрадукцыі, а хтосьці ўзводзіць простыя садовыя домікі. Не ва ўсіх садоўніцкіх таварыствах можна размясціць пэўныя аб'екты інфраструктуры.

Пры гэтым дзеючае заканадаўства не перашкаджае пераводу садоўніцкага таварыства ў жылую забудову, звярнуў увагу **кансультант аддзела прававога забеспячэння зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі юрыдычнага ўпраўлення Дзяржкаммаёмасці Аляксандр ПАЎЛАЎ.** Прыклады ёсць на тэрыторыі Мінскай вобласці. Так, у Мінскім раёне дачны кааператыў быў далучаны да Ждановічаў. «Але прынцыповае пытанне ў тым, што дзеючым садоўніцкім таварыствам вельмі цяжка выканаць патрабаванні, што прад'яўляюцца да населеных пунктаў паводле архітэктурных, будаўнічых, супрацьпажарных нормаў і правілаў», — дапоўніў ён.

Акрамя таго, для пераводу дачнага кааператыва патрабуецца рашэнне агульнага сходу садоўніцкага таварыства аб ліквідацыі. Як паказвае практыка, нават у таварыствах з развітой інфраструктурай складаць такі сход, на які «за» да таго ж павінны прагаласаваць дзве трэціны членаў, не заўсёды рэальна.

## Трэба нешта ўдакладніць ці нават спрасціць

Міністэрства эканомікі ва ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі органамі вядзе работу па ўдасканаленні заканадаўства аб садоўніцкіх таварыствах. Як паведаміла **кансультант юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства эканомікі Ірына СКАЧКОВА,** падрыхтаваны змяненні ва Указ № 50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садоўніцкіх таварыстваў».

Праект указа ў красавіку гэтага года прайшоў грамадскае абмеркаванне на прававым форуме. Па словах прадстаўніка Мінэканомікі, прапануецца спрасціць парадак змены межаў зямельных участкаў, калі праект арганізацыі і забудовы тэрыторыі садоўніцкага таварыства быў зацверджаны да ўступлення ў сілу Указа № 50 — да 7 жніўня 2008 года. У такіх выпадках вызначэнне межаў пры адсутнасці зямельнай спрэчкі можа быць выканана па фактычным карыстанні, без унясення змяненняў.

Ірына Скачкова таксама закранула пытанне аб фарміраванні членскіх узносаў у садоўніцкіх таварыствах. Дзеючая ў цяперашні час норма выклікае шмат пытанняў, зваротаў і скаргаў з боку членаў таварыстваў. На думку Мінэканомікі, норму трэба змяніць і даць права садоўніцкім таварыствам самастойна вырашаць такія пытанні на ўзроўні агульнага сходу або сходу ўпаўнаважаных.

Маюцца і іншыя меркаванні, якія кажуць пра тое, што членскія ўзносы не павінны залежаць ад плошчы і колькасці зямельных участкаў, паколькі ў асноўным накіроўваюцца на аплату працы работнікаў. Акрамя таго, у праекце прапануецца ўрэгуляваць пытанні аб членстве асоб, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі долевай уласнасці на зямельны ўчастак і садовы домік.

## Дыферэнцыяцыя тарыфаў і крадзеж электрычнасці

**Начальнік упраўлення збыту энергіі «Белэнерга» Віктар ЖЫТКЕВІЧ** адзначыў, што садоўніцкія таварыствы разлічваюцца з энергазабеспячальнай арганізацыяй як юрыдычная асоба па групавым прыборы ўліку электрычнай энергіі, які павінен усталёўвацца на мяжы электрычных сетак. Выпадкі крадзяжу электраэнергіі сапраўды адбываюцца, у тым ліку ў садоўніцкіх таварыствах. Але асобнага ўліку, колькі было выкрадзена электрычнай энергіі, таварыствамі не вядзецца. Іншае пытанне, што да спецыялістаў аб'яднання паступае велізарная колькасць зваротаў старшыняў садоўніцкіх таварыстваў аказаць ім садзейнічанне ў выяўленні крадзяжоў электраэнергіі ўнутры саміх дач.

«На жаль, мы не надзелены паўнамоцтвамі аказваць садзейнічанне праўленням садоўніцкіх таварыстваў у выяўленні безуліковага спажывання электраэнергіі. Гэтую праблему можна вырашыць толькі з дапамогай адпаведных спецыялістаў, заключыўшы з імі дагаворы на аказанне такой паслугі. А самае дзейснае мерапрыемства, якое дазваляе амаль на 100 % выключыць крадзеж электраэнергіі ўнутры садоўніцкіх таварыстваў, — гэта вынас прыбораў уліку за мяжу землеўладання ўчастка», — параіў Віктар Жыткевіч.

Дарэчы, у пачатку года запазычанасць садовых таварыстваў за электраэнергію складала каля васьмі мільёнаў рублёў. У першую чаргу гэта звязана з сезоннасцю пражывання ў такіх таварыствах. Электраэнергія спажываецца цэлы год, штомесяц, кожныя суткі, а сабраць грошы з грамадзян зімой не заўсёды ўяўляецца магчымым. Па стане на 1 жніўня запазычанасць значна знізілася і складае каля трох з паловай мільёнаў рублёў.

У нашай краіне сёлета з 1 ліпеня ўведзена дадатковая дыферэнцыяцыя тарыфаў на электраэнергію для насельніцтва па часавых перыядах, пашыраны катэгорыі грамадзян, якія могуць перайсці на выкарыстанне электрычнай энергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння па адзіным тарыфе 0,0761 рубля за 1 кВт • г. Чаму гэтыя тарыфы, а таксама дыферэнцыраваныя тарыфы нельга ўжываць у дачных дамах?

Эксперт «Белэнерга» растлумачыў, што гэты тарыф быў устаноўлены для аплаты насельніцтвам спажытай электрычнай энергіі ў жыллёвым фондзе. Сёння ў адпаведнасці з Жыллёвым кодэксам дачныя садовыя домікі не адносяцца да жылфонду. З энергазабеспячальнымі арганізацыямі садоўніцкія таварыствы разлічваюцца як юрыдычныя асобы па тарыфе, устаноўленым для насельніцтва. Гаворка ідзе аб пастанове ад 27 лютага 2017 года № 16. Гэты тарыф складае 17,46 капейкі за 1 кВт • г.

## Правярайце сябе самі

**Начальнік юрыдычнага аддзела Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Тамара ПРАСКОВА** адзначыла, што на адрас Мінаблвыканкама паступае вельмі шмат зваротаў з просьбай праверыць фінансава-гаспадарчую дзейнасць дачных структур. «У гэтай сувязі хацела б звярнуць увагу, што варта даць паўнамоцтвы свайму ўнутранаму рэвізійнаму органу, паколькі ён першасны. Таму што, як правіла, падстаў, каб выйсці на праверку іншаму дзяржаўнаму органу, недастаткова з той інфармацыі, якая дадзена грамадзянамі. Яна не пацвярджаецца дакументамі», — адзначыла Тамара Праскова.

«Калі казаць пра кантроль з боку органаў мясцовай улады, то мы не практыкуем праверкі садоўніцкіх таварыстваў. Калі маюць месца прыкметы правапарушэнняў, якія носяць крымінальна каральны характар, трэба па заяўным прынцыпе звярнуцца ў праваахоўныя органы па месцы знаходжання таварыства», — растлумачыла Тамара Праскова.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Новыя тэхналогіі для спрадвечнага

### Беларускія навукоўцы прэзентавалі першы айчынны комплекс па ўборцы лёну

**Адпаведнае мерапрыемства прайшло на Шклоўскім ільнозаводзе. Новае абсталяванне складаецца з чатырох спецыялізаваных машын для механізацыі працэсу і дазваляе правесці поўны цыкл уборкі лёну.**

Тэхніку распрацавалі ў Навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Узровень лакалізацыі навінкі каля 80—90 %. У комплекс уваходзяць чатыры агрэгаты — церабілка (агульны кошт разам з трактарам — 60 000 рублёў, імпартныя аналагі даражэйшыя амаль у 10 разоў), абгуртоўвальнік і варушылка-ўзбівальнік лентаў ільну, самаходны прэс-падборшчык. Беларускія машыны ні ў чым не саступаюць замежным аналагам, толькі што ў цане. Некаторыя айчынныя прыстасаванні таннейшыя ў два і больш разоў.

Сярод прадпрыемстваў, задзейнічаных у стварэнні комплексу, ААТ «Калінкавіцкі рамонтна-механічны завод», ДП «Эксперыментальны завод», ТДА «ГідраТэхСэрвіс», ААТ «Гомсельмаш», ААТ «ККХ Бабруйскаграмаш», ААТ «Беларусьрызінатэхніка» і іншыя.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Футбол

# БАТЭ ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ЕЎРАКУБКАЎ

**Чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ ў дамашнім матчы праявіў добры байцоўскі характар, але ўсё ж вылецеў з розыгрышу Лігі Еўропы.**

Пасля бязвольнага паражэння ад «Астаны» ў Нур-Султане з лікам 0:3 мала хто верыў у магчымасць адыграцца дома. Але на сваім полі БАТЭ адразу ўзяўся за справу, і ўжо на 6-й хвіліне


Фота БелТА.

матча Максім Скавыш адкрыў лік. Далей гаспадары на працягу амаль усёй гульні валодалі ініцыятывай, востра атакавалі і ствaралі небяспечныя моманты, але забіць змаглі толькі яшчэ адзін раз напрыканцы матча — на 85-й хвіліне прыгожы ўдар атрымаўся ў Яўгена Яблонскага. Надзея на трэці гол і перавод гульні ў дадаковы час пражыла яшчэ амаль дзесяць хвілін, але, на жаль, так і не спраўдзілася. Сёлета чэмпіён Беларусі не змог падарыць беларускім аматарам футбола еўракубкавую восень.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Джузэпе Контэ фарміруе новы ўрад Італіі

Перад прэм'ер-міністрам Італіі Джузэпе Контэ стаіць складаная задача. Ён павінен сфарміраваць новы ўрад з партыямі, у якіх мала агульнага, акрамя нянавісці да правай партыі «Ліга», адзначыў Euronews. На думку некаторых італьянскіх СМІ, саюз «Руху пяці зорак» з левацэнтрысцкай Дэмакратычнай партыяй выглядае такім жа дзіўным, як і папярэдняя кааліцыя «пяцізорачнікаў» з «Лігай». Матэа Сальвіні, вінаўнік цяперашняга палітычнага крызісу, пакуль знаходзіцца ўбаку ад усіх абмеркаванняў. Віцэ-прэм'ер, міністр унутраных спраў, які сыходзіць з пасады, спадзяецца, што ў яго апанентаў нічога не атрымаецца і ў краіне правядуць датэрміновыя выбары. «У нас усё яшчэ ёсць час, прэзідэнт Матарэла, — папярэдзіў Матэа Сальвіні. — Вы паспееце вярнуць уладу тым, хто мае яе ў гэтай краіне, грамадзянам Італіі. Улада належыць народу». Як вядома, Сальвіні не будзе прысутнічаць на сустрэчах, якія Контэ праводзіць з найбуйнейшымі партыямі. Чакаецца, што прэм'ер-міністр сустрэнецца з лідарамі Дэмакратычнай партыі Ніколай Зінгарэці і «Руху пяці зорак» Луіджы Дзі Маё. У бліжэйшыя дні наноў прызначаны прэм'ер павінен прадставіць сфарміраваны ім кабінет прэзідэнту краіны Серджо Матарэле.

## Калумбійскія паўстанцы зноў бяруцца за зброю



Спецыяльны трыбунал Калумбіі выдаў ордар на арышт аднаго з лідараў былых паўстанцаў з Рэвалюцыйных узброеных сіл Калумбіі (РУСК/FARC), які абвясціў аб намеры зноў узяцца за зброю. Іван Маркес з РУСК апублікаваў відэа, дзе ён на фоне двух дзясяткаў людзей заяўляе аб стварэнні новай групы, якая будзе весці ўзброеную барацьбу супраць прыгнёту. «Калумбія не пацерпіць ніякіх пагроз і тым больш пагроз з боку наркамафіі», — заявіў прэзідэнт Калумбіі Іван Дуке. Акрамя Маркеса, ордары на арышт выдадзены на імя іншага вядомага лідара РУСК Хесуса Сантрыча і яшчэ некалькіх былых паўстанцаў. Мірнае пагадненне калумбійскіх уладаў з РУСК было падпісана ў 2016 годзе. Дагавор паклаў канец пяцідзесяцігадоваму ўзброенаму супрацьстаянню. Два гады таму рух быў пераўтвораны ў палітычную партыю.

## У Эфіопіі знайшлі ранняга продка чалавека

У Эфіопіі знайшлі чэрап мужчынскай асобіны ранняга продка чалавека, які жыў 3,8 мільёна гадоў таму. Знаходка ставіць пад сумнеў уяўленні пра тое, якім чынам першыя людзі эвалюцыяніравалі з чалавекападобных малпаў. Навукоўцы высветлілі, што чэрап належыць анамскаму аўстралапітэку, што, як мяркуецца, з'явіўся 4,2 мільёна гадоў таму. Раней лічылася, што гэты від быў продкам афарскага аўстралапітэка, з якога мог пайсці род Homo (чалавек). Доказам таму служыў частковы шкілет самкі афарскага аўстралапітэка, названай Люсі, які знайшлі ў Эфіопіі ў 1974 годзе. Яна жыла каля 3,18 мільёна гадоў таму. Тым часам аналіз новай знаходкі паказвае, што анамскія аўстралапітэкі не былі продкамі афарскіх і суіснавалі адначасова на працягу як мінімум 100 тысяч гадоў. Чэрап знайшоў у мястэчку Міро-Дора прафесар клііўлендскага прыродазнаўча-гістарычнага музея Ёханес Хайле-Сесасія. Паводле яго слоў, на цяперашні момант гэты чэрап найлепш захаваўся сярод чарапоў, старэйшых за тры мільёны гадоў.

Падзея

# НА ВЕРНАСЦЬ НАРОДУ І АЙЧЫНЕ


Фота Вячаслава ЦУРАНАВА.

**Першакурснікі Акадэміі МУС прынеслі ўчора ў Мінску прысягу. Мерапрыемства адбылося на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Словы вернасці народу і Айчыне ў прысутнасці сваіх родных і блізкіх вымавіў 421 малады курсант.**

Яны накіраваны на вучобу падраздзяленнямі Міністэрства ўнутраных спраў, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю. Курсанты ўжо прайшлі праз вучэбны збор, які быў арганізаваны для іх у жніўні. Там яны атрымалі першасныя прафесійныя веды.

Вучыцца давядзецца чатыры гады. Першакурснікі залічаны на спецыяльнасці «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Судовыя крыміналістычныя экспертызы». Двое курсантаў адпраўлены ў Маскоўскі ўніверсітэт МУС Расіі. Там яны будуць асвойваць таямніцы псіхалогіі службовай дзейнасці.

— Служба ў праваахоўных органах будзе патрабаваць ад вас высокай прафесійнай падрыхтоўкі, стойкасці, вытрымкі, самаадачы, — адзначыў **міністр унутраных спраў Беларусі Юрый КАРАЕЎ.** — Вы — людзі нялёгкай, але мужнай прафесіі. Ва ўсе часы станаўлення і развіцця нашай дзяржавы органы ўнутраных спраў цвёрда стаялі на варце законнасці і правапарадку. Народ Беларусі з павагай і даверам адносіцца да людзей у міліцэйскай форме, удзячны за тое, што заўжды можа разлічваць на нашу абарону, дапамогу і падтрымку. Але памятайце — гэта залежыць ад кожнага з нас. Сёння вы вымавілі самыя галоўныя словы прысягі — «Клянуся абараняць законныя інтарэсы грамадзян, грамадства і дзяржавы». Памятайце іх усё далейшае жыццё. Вучоба ў Акадэміі МУС павінна стаць тым зыходным рубяжом, які ставарае асобу прафесіянала, дазваляе годна несці эстафету старэйшага пакалення. У сценах акадэміі сабраліся дасведчаныя людзі, якія і навуку вывучалі, і затрымлівалі злачынцаў, ахоўвалі грамадскі парадак. У іх ёсць шмат чаму павучыцца. Ніхто не мае права губляць ні хвіліны — гэтыя чатыры гады дадуць веды, загартоўку на вельмі доўгі час службы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




**Супрацоўнікі групы тэхнічнага нагляду ДАІ Фрунзенскага РУУС Мінска могуць пахваліцца багатым «ураджаем» тых кіроўцаў, якія не праходзяць своечасова тэхагляд. Разам з імі карэспандэнты «Звязды» падзяжурылі ўвечары аднаго буднага дня на вуліцы Каменнагорскай. Менш чым за паўгадзіны інспектары выявілі трох парушальнікаў.**

Тэма

# «МНЕ СКАЗАЛІ, Я І ПАЕХАЎ»

## Чаму кіроўцы не праходзяць тэхагляд?

Ужо літаральна праз пару хвілін інспектар спыняе чорную «Аўдзі». Талон тэхагляду выдадзены ў 2018 годзе. Але... у сакавіку.

— Грошай асабліва пакуль няма, — скардзіцца кіроўца Максім. — Тэхагляд каштуе 260 рублёў. Я асабліва і не езджу на аўто. Сёння сеў за руль першы раз за даволі працяглы тэрмін. Але цяпер, пэўна, трэба будзе заехаць на станцыю дыягностыкі. Калі далі штраф зараз, то могуць спыніць і пасля, і што ж, зноў плаціць грошы?

— За адсутнасць тэхагляду першы раз частка 5 артыкула 18.12 КаАП прадугледжвае папярэджанне або штраф ад адной да трох базавых велічынь, — каментуе сітуацыю **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Фрунзенскага раёна Мінска Яна РАМАНЕНКА.** — Пры паўторнасці на працягу года штраф складзе ўжо ад дзвюх да пяці базавых. Хоць бывала і так, што акрамя адсутнасці тэхагляду выяўляўся яшчэ цэлы букет іншых парушэнняў.

Другім без запаветнага талона на лабавым шкле быў спынены грузавы «Опель». Дакумента, які пацвярджаў бы праходжанне тэхагляду, у кіроўцы таксама не знайшлося. Колькі часу ў такім стане ездзіць гэты фургон — пытанне добрае. Кіроўца тлумачыць сітуацыю: машына не яго, а сябра. А сертыфікат, маўляў, забыў дома.

— Зараз праверым сітуацыю, — усміхаецца інспектар.

Ён дастае планшэт, некалькі секундаў чаруе над экранам і пасля абвяшчае:

— Ды ў вас жа тэхагляд пратэрмінаваны ледзь не на год. Што ж, будзем складаць адміністратыўны матэрыял.

Пасля таго як кіроўца ад'ехаў, Яна Раманенка патлумачыла сітуацыю.

— На кожны хітрык з боку кіроўцы ў нас свой адказ. Раней, калі чалавек казаў, што забыў сертыфікат дома, мы складалі адпаведны рапарт, прызначалі дадатковую праверку, накіроўвалі запыт у РУП «Белтэхагляд» з просьбай даць адказ на пытанне, праходзіла машына на тэхагляд або не. Затым працэс спрасціўся. Мы змаглі атрымліваць патрэбную інфармацыю ад спецыялістаў «Белтэхагляду» па тэлефоне на працягу дня. Ну а цяпер і зусім усё проста. Заходзім на сайт непасрэдна з патрульнага аўтамабіля, і праз некалькі секундаў уся інфармацыя з'яўляецца перад інспектарам.

Трэцім да нас трапіў зялёны грузавы «Рэно». Аўтамабіль французскага вытворцы належыць адной са сталічных арганізацый. Вёз ён металаканструкцыі вагой некалькі тон. На лабавым шкле дазвол на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху наклеены, але... датаваны ён мінулым годам. А дакладней кажучы, сакавіком. Гэта значыць, ужо з 1 красавіка аўтамабіль ездзіў з пратэрмінаваным дакументам. І больш за тое, службовыя асобы выпускалі такую машыну ў рэйс, ставячы свае подпісы пад допускам да руху. Тут ёсць глеба для разважанняў. Калі гэта рабілася несвядома, то ўзнікае пытанне да таго, хто даваў «дабро» на выезд аўтамабіля, чаму ён не звярнуў увагу на тое, што ў аўтамабіля фактычна няма дазволу для ўдзелу ў дарожным руху. Калі ж свядома, то пытанняў узнікае яшчэ больш.

— Я — чалавек просты, — кажа кіроўца Дзмітрый. — Мне сказалі, я і паехаў. Можна, канешне, і адмовіцца, але якія будуць наступствы? Тэлефануйце дырэктару, з ім і вырашайце гэтую справу.

Інспектары набралі нумар. Мяркуючы па тоне гутаркі, субяседнік на тым канцы провада быў не вельмі здзіўлены сітуацыяй, якая склалася.

Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуць дваіх — і службовую асобу, якая паставіла допуск да руху, і кіроўцу.

— Па словах кіроўцы, за ўсё адказвае дырэктар. Ён і допусціў яго ў рэйс. Па тэлефоне ён гэта пацвердзіў. На наступны дзень мы будзем разбірацца з гэтым далей. Для яго надыдзе адказнасць па артыкуле 18.24 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Штраф там складае ад чатырох да шасці базавых. Акрамя гэтага, будзе выдадзена прадпісанне, каб у пэўны тэрмін гэтыя недахопы былі ліквідаваны. Тое, як гэта выканаюць, мы праверым па базе даных. Калі да нас не прыслухаюцца — зноў прыцягнем да адказнасці. Але спадзяюся, што да гэтага не дойдзе. Хоць тэарэтычна такі цыкл можна працягваць да бясконцасці. Сутыкаемся мы з гэтым не ўпершыню і чуем ад кіраўніцтва адказ як пад капірку — «у арганізацыі няма сродкаў, працуем з абароту, выжываем кожны дзень, таму вымушаны так рабіць». Але толькі за сёння было шэсць парушэнняў у службовых асоб, чый транспарт ездзіў у Фрунзенскім раёне без пройдзенага своечасова тэхагляду. І пяць з іх ужо прыцягнуты да адказнасці. Гэта ўсё толькі за чатыры гадзіны! Фізічных асоб пры гэтым было толькі тры...

— Мы яшчэ ходзім і з планавымі праверкамі ва ўсе арганізацыі нашага раёна. Калі выяўляем, што ў рэйс выйшаў аўтамабіль з пратэрмінаваным тэхаглядам, то не толькі прыцягваем да адказнасці службовых асоб, але і выдаём прадпісанні. Эксплуатацыя такой тэхнікі забараняецца, а ўладальніку даецца пэўны тэрмін, каб ліквідаваць гэты недахоп. Гэты ж аўтамабіль быў не з нашага раёна. У адваротным выпадку мы заўтра з самай раніцы пайшлі б туды з папярэдне запланаваным вывучэннем парадку выпуску транспарту на лінію. А так мы накіруем прадстаўнікам тэхнічнага нагляду ДАІ Заводскага раёна сталіцы інфармацыю, каб яны схадзілі ў тую арганізацыю.

Парадаксальна, але яшчэ не так даўно сустракаліся выпадкі падробкі штампаў у сертыфікаце аб праходжанні тэхнічнага агляду. Цяпер гэта рэдкасць. Гэта і лагічна — правесці некалькі год за кратамі, захацеўшы сэканоміць 130 долараў у эквіваленце, — варыянт не найлепшы.

— А калі аўтамабіль доўгі час не эксплуатуецца, то які сэнс для яго ў праходжанні тэхагляду?

— Такія выпадкі нярэдкія. У такім разе мы па дакументацыі аналізуем, ці здзяйсняла гэтая машына выезды. Калі паведамленая нам спачатку інфармацыя пацвярджаецца, аўтамабіль стаіць на тэрыторыі прадпрыемства за плотам і нікуды не едзе, то тут ніякіх пытанняў няма. Праўда, яны могуць узнікнуць, калі аўтамабіль усё-такі будзе «рэанімаваны» і выберацца на дарогу...

— А наколькі добрасумленныя ў гэтым плане матацыклісты?

— З тэхаглядам у іх парадку, скажам шчыра, больш, чым у аўтамабілістаў. Магчыма, гэта з-за таго, што дыягностыка для іх каштуе танней. Парушэнні ва ўладальнікаў двухколавага транспарту іншыя. Гэта перавышэнне хуткаснага рэжыму, небяспечнае манеўраванне, тая ж язда на адным коле... Таксама яны любяць пакатацца на матацыкле з пасведчаннем кіроўцы аўтамабіля. Здаваць на асобную катэгорыю лянота, а займець новыя адчуванні хочацца.



— Ці ёсць «рэкардсмены» сярод уладальнікаў аўтамабіляў, якія не плацілі штрафы?

— Вось літаральна сёння нашаму экіпажу трапіўся чалавек, які ўжо мае тры ці чатыры спагнанні. Аднаму такому грамадзяніну сёння быў выпісаны штраф і як кіроўцу, і як службовай асобе — ён індывідуальны прадпрымальнік, які займаецца грузаперавозкамі. І ён кажа: штрафы я заплачу, усё разумею, але... тэхагляд праходзіць усё роўна не буду. Агулам жа «паўторнікаў» у нас крыху менш за трацiну ад агульных выпадкаў.

Увогуле, на працэдуру праходжання тэхагляду адводзіцца амаль цэлы месяц. Калі пазначана, што дата наступнай паверкі — жнівень 2019 года, то для таго, каб атрымаць запаветны сертыфікат, ёсць цэлы каляндарны месяц — з 1-га да 31-га чысла. 1 верасня карэта, у адрозненне ад распаўсюджанай пагаворкі, у гарбуз не ператворыцца, аднак у супрацоўнікаў ДАІ ўжо ўзнікнуць пытанні.



**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

Спецыяльны рэпартаж

# ЗНІШЧЫЦЬ ДУРМАН

## Карэспандэнты «Звязды» выправіліся ў антынаркатычны рэйд



**Праваахоўнікі сур'ёзна занепакоены ростам спажывання ў краіне марыхуаны, якая разам з гашышам займае 80 % прадуктаў наркарынку. Па звестках МУС, сёлета падчас праграмы «Мак», якая праводзіцца з чэрвеня да верасня, знішчана больш за 70 гектараў (78 тон) дзікарослых канапель і маку.**
**Журналісты «Звязды» ў рамках антынаркатычнай праграмы далучыліся да супрацоўнікаў Буда-Кашалёўскага РАУС.**



Старшы ўпаўнаважаны Уладзімір ІВАНОЎ.

### ТРОХМЕТРОВЫЯ КАНОПЛІ

— Каноплі спеюць да сярэдзіны верасня. Таму наша задача — паспець знішчыць іх да таго, як яны трапяць у рукі наркаманаў, — тлумачыць **старшы ўпаўнаважаны групы па незаконным абароце наркотыкаў і супрацьдзеянні гандлю людзьмі капітан міліцыі Уладзімір ІВАНОЎ.**

Насенне дзікарослых канапель разносяць вецер, птушкі. На Гомельшчыне, кажа суразмоўнік, добры клімат для нарказмяшчальных раслін: цёпла, вільготна. На поўдні краіны яны могуць вырастаць да трох метраў у вышыню.

— Кожны год на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна знішчаем каля чатырох гектараў канапель і маку, — прыводзіць статыстыку Уладзімір Васілевіч. — Плантацыя, на якую мы накіроўваемся, — два з паловай гектары, там можа расці амаль тры тоны дурманлівай расліны.

Дзікарослыя каноплі знайшлі паблізу аграгарадка Дуравічы. Населены пункт знаходзіцца за 12 кіламетраў на ўсход ад Буда-Кашалёва і за 40 — ад Гомеля.

— Каноплі любяць гной, а ферм у нас хапае, — тлумачыць суразмоўнік. — Размнажаецца расліна хутка. Каб знішчаць яе канчаткова, трэба апрацоўваць палеткі хіміяй. Гэта дорага і шкодна для глебы: потым тут наўрад ці нешта вырасце.

Змагацца з раслінай дапамагае сельскагаспадарчая тэхніка.

— Айчынны пагрузчык «Амкадор» усюды пройдзе! — хваліць машыну кіроўца Уладзімір Удодаў. — Некалькі дзён карпатлівай работы — і поле будзе чыстае.

Выкарчаваныя каноплі або здрабняюць, або спальваюць, або закопваюць.



— З каноплямі на невялікіх плошчах спрабуем змагацца і з дапамогай кукурузы. Яна не дае дурманлівай расліне шанцаў выжыць, забірае ўсё каштоўнае з зямлі сабе, — дадае капітан міліцыі. — Да кожнага поля міліцыянера ці агрэнома не прыставіш. Ды і фізічна ўсёды не паспець. Таму чарговы раз даводзіцца нагадваць аграрыям, што за тэрыторыямі, якія знаходзяцца на балансе сельгаспрадпрыемстваў і на якіх «водзяцца» дзікарослыя каноплі, неабходна сачыць.

### ВЕТРАМ ЗАНЕСЛА?

— Добры дзень! Мак, каноплі вырошчваеце? — звяртаецца да мужчын на лаўцы каля плота **малодшы ўчастковы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі сяржант міліцыі Аляксей МЕЛЬНІКАЎ.**

— На гэтым агародзе што хочаш ёсць, — усміхаецца гаспадар драўлянага дома Аляксандр Мікалаевіч Карпухін. — Бабка мая абязножала, захварэла, дык у градках чорта знайсці можна!

— Гэта ж незаконна! — уступаю ў размову.

— Ды я жартую! Можаце праверыць. На такое глупства часу ў мяне няма. Лепей памідоры мае сфатаграфуйце. Дзед сам вырасціў! — выхваляецца пенсіянер.

Па статыстыцы, незаконным абаротам «траўкі» займаюцца людзі з частковай занятасцю або беспрацоўныя. У асноўным мужчыны да 35 гадоў. Нярэдка — раней асуджаныя па артыкуле, які звязаны з наркотыкамі.

— Калі некалькі кустоў канапель ці маку растуць у агародзе, можна паспрабаваць паверыць, што чалавек не садзіў іх уласнаручна. Ветрам прынесла, а гаспадар і не заўважыў. Напрыклад, дачнік, які бывае ў загарадным доме раз у месяц. «Толькі збіраўся пайсці на агарод, а тут вы прыехалі», «Часу не хапае за ўсім угледзець», «Учора яшчэ нічога не было, гэта яна за ноч так вымахала», — чуем ад жыхароў. Кожны выпадак разглядаецца ў прыватным парадку.

Але трэба памятаць, што згодна з артыкулам 16.1 КаАП «Пасеў або вырошчванне без мэты збыту або вырабу наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў забароненых да апрацоўкі раслін ці грыбоў, якія змяшчаюць наркатычныя сродкі або псіхатропныя рэчывы» цягнуць папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дваццаці базавых велічынь.

Мы развіталіся з Аляксандрам Мікалаевічам і рушылі далей.

### МАРЫХУАНА ПАД ЛЯМПАЙ

— Іншая рэч, калі нарказмяшчальныя расліны гадуюцца ў спецыяльна абсталяваных памяшканнях, — працягвае Уладзімір Іваноў. — Так, у канцы ліпеня ў сталіцы затрымалі 25-гадовага хлопца, які вырошчваў каноплі ў кватэры. Расліны мінчанін размясціў у палатцы з ізаляцыйнай фольгай, лямпай дзённага святла, двума вентылятарамі, гадзіннікам-таймерам, блокам сілкавання.

Малады чалавек працаваў повaрам у закусачнай, жыў з бацькамі. Пра тое, што сын вырошчвае каноплі, яны не ведалі. Хлопец запэўніў, што разводзіць «агародныя культуры». Усяго быў канфіскаваны 31 грам марыхуаны.

Згодна з часткай 2 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса «Незаконны з мэтай збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка або перасылка або незаконны збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсораў або аналагаў» караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў са штрафам або без штрафу. Без мэты збыту — абмежаванне волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленне волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў (частка 1 артыкула 328 КК).

— Апраўданняў, чаму «ўцягнуўся» ў наркабізнес, няма, — упэўнены Аляксей Мельнікаў. — Гэта проста прага лёгкіх грошай! Не пойдзе гультай на ферму працаваць ад цямна да цямна.

Заробак у гандляроў раслiннымі наркотыкамі невялікі, але ўсё залежыць, канешне, ад аб'ёмаў. Мак, напрыклад, могуць аддаць нават за бутэльку гарэлкі або віна. На апошняе часцей за ўсё ідуць людзі з алкагольнай залежнасцю.



Участковы Аляксей МЕЛЬНІКАЎ, Святлана Яўгенаўна і Аляксандр Васілевіч ЮЦЯНКОВЫ.

— Звычайна той, хто прадае наркотык, ужывае і сам. Наркаманы па сваёй натуры адзіночкі — не любяць дзяліцца! Але «здаюць» адно аднаго з задавальненнем. Маўляў, мяне не чапайце, я лепей пра Васіля раскажу! — гаворыць Уладзімір Васілевіч.

Тэлефануючы ў міліцыю з просьбай праверыць «падазронага» суседа і самі жыхары. Але часцей за ўсё праваахоўнікі даведваюцца пра наркагандляроў ад уласных крыніц. Сітуацыю пад кантролем трымаюць і ўчастковыя інспектары.

### У СТАЛІЦЫ — «ХІМІЯ», У ПРАВІНЦЫІ — РАСЛІННЫЯ

— У савецкі час каноплямі засявалі цэлыя палі. Ведаеце, якія трывалыя вяроўкі з іх рабілі? — сустракаюць на ганку Святлана Яўгенаўна і Аляксандр Васілевіч Юцянковы. — Нашы матулі саджалі каноплі каля яблынь, каб жука не было. Тады і плады кожны год збіралі! А зараз што?

Юцянковы жывуць у Буда-Кашалёве каля 30 гадоў. Раней, кажуць, у іх, маладых, нават і думак пра наркотыкі не было: «Працавалі цэлымі днямі, марылі галаву на падушку хутчэй палажыць».

Узрост тых, хто ўжывае «мясцовыя» наркотыкі, вар'іруецца ад 14 да 50 гадоў. Месяц таму, расказвае Уладзімір Васілевіч, затрымалі 43-гадовую жанчыну. «На ігле» яна з 2000 года. Але ў асноўным гэта ўсё ж такі моладзь.

— Калі ўзяць вялікія гарады, напрыклад Мінск, то там больш распаўсюджана «хімія» — сінтэтычныя наркотыкі (альфа-PVP, спайсы). У правінцыі — наркотыкі расліннага паходжання, — кажа капітан міліцыі.

Першы раз за ўжыванне наркотыку расліннага паходжання прадугледжана адміністрацыйная адказнасць і пакаранне ў выглядзе штрафу ад 5 да 10 базавых велічынь (часткі 4—6 артыкула 17.3 КаАП). Паўторна на працягу года — крымінальная адказнасць.

— Але самае страшнае тут нават не адказнасць, а тая шкода, якую наркаманы робяць самі сабе, — дадае Уладзімір Васілевіч. — Не буду ўдавацца ў падрабязнасці, але скажу, што пакутуе ўвесь арганізм! Экстракцыйны опій, які наркаманы атрымліваюць з насення маку, па сваім дзеянні параўнальны з гераінам і метадонам. Працягласць жыцця спажыўцоў — пяць-сем гадоў. Як паказвае практыка, сасkочыць з наркатычнай залежнасці вельмі цяжка.

— Макі — кветкі прыгожыя. Раней уздоўж дарожкі пасаджу і любуюся! Даўно гэта, праўда, было, — уздыхае Святлана Яўгенаўна. — Ну яго! Як пачую па тэлевізары, што ён з людзьмі робіць, — страх! Адзінае, магу крыху маку купіць, каб у булкі ці бліны дадаць. Муж любіць.

Трэба адзначыць, што мак, які мы выкарыстоўваем для харчовай прамысловасці, не мае нічога агульнага з макам, з якога робяць наркотык. У крамах прадаецца апрацаваны, «чысты» прадукт.

На пытанне, чаму ў нас нельга легалізаваць марыхуану, як у многіх іншых краінах, пенсіянеры ўпэўнена адказваюць: «Наступствы будуць страшныя. А здароўе нацыі трэба берагчы».

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*Мінск — Буда-Кашалёва — Мінск.*

## Извещение о проведении повторного аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **13 сентября 2019 г.** в 10.00 в здании Поставского райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал) | | | | | | |
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | 1 | Волковский сельисполком, Витебская обл., Поставский район, д. Кривое-2, ул. Центральная, 7А | 0,1762 | 224080809601000035 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) – оз. Кривое и в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 В | 2000,00 | 2103,87 |
| | 2 | Козловщинский сельисполком, Витебская обл., Поставский район, д. Ласица, ул. Каштановая, д. 51 | 0,1591 | 224082006601000028 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) -оз.Ласица | 2500,00 | 1843,14 |
| | 3 | Воропаевский сельисполком, Витебская обл., Поставский район, д. Макарщина, ул. Набережная, д. 6А | 0,2321 | 224085409101000046 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) -оз.Белое и в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 В | 3000,00 | 2179,18 |
| | 4 | Юньковский сельисполком, Витебская обл., Поставский район, д. Яцевичи, ул. Центральная, 3Б | 0,1798 | 224084931501000035 | нет | 4000,00 | 1421,00 |
| | 5 | Новоселковский сельисплком, Витебская обл., Поставский район, д. Гавриловичи, ул. Приозерная, д. 5 В | 0,25 | 224084003601000060 | нет | 2000,00 | 1100,76 |
| | 6 | Куропольский сельисполком, Витебская обл., Поставский район д. Черты, ул. Озерная, 40Д | 0,1734 | 224082709101000143 | Водоохранная зона водного объекта оз. Черты | 2500,00 | 1549,55 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона | - в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, в т. ч. государственной регистрации;<br>- в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>- приступить к занятию земельного участка в течение года со дня государственной регистрации земельного участка, возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) | | | | | | |
| Порядок осмотра на местности земельного участка | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе.<br>Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г.Поставы, пл.Ленина,25, 1-й этаж, каб.11 | | | | | | |
| Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. | | | | | | |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание Поставского райисполкома,1-й этаж, каб. 11<br>в рабочие дни с 8.00 до 17.00<br>Прием заявлений по повторным аукционам проводится со дня публикации извещения до 10 сентября 2019 г. включительно | | | | | | |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет соответствующего сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе. | | | | | | |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание Поставского райисполкома, 1-й этаж, каб. 11,<br>в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8 (02155) 43180,41132, 23310, 23440, 58828, 23457 | | | | | | |
| Извещения о проведении аукционов были опубликованы | - Волковский сельисполком – 08.11.2017 г.<br>- Воропаевский сельисполком – 06.09.2018 г.<br>- Козловщинский сельисполком – 14.01.2017 г.<br>- Куропольский сельисполком – 05.12.2017 г.<br>- Юньковский сельисполком – 14.11.2016 г.<br>- Новоселковский сельисполком – 27.06.2012 г., 07.05.2013 г. | | | | | | |

УНП 300088286, 300085723, 300077168, 300085631, 300085644, 300078307.

**2 октября 2019 г.** **№13-А/2019**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул.Лепешинского (в районе жилого дома №147) | 340100000002006309 | 0,1335 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | ограничений в использовании не имеет | 99 | 9 879,00 | 400,00 | 3 578,54 |
| 2 | ул. Ясная (между усадебными жилыми домами №56 и №60) | 340100000004001368 | 0,0771 | | охранные зоны линий связи и радиофикации | 99 | 6 198,24 | 200,00 | 1 746,12 |
| 3 | пер. Луговой 2-й (участок № 1) | 340100000008005092 | 0,1500 | | Водоохранная зона рек и водоемов. Формирование проезда общего пользования совместно с владельцем смежного участка. *Проведение комплекса противопаводковых мероприятий (защита территории от 1 % затопления паводковыми водами)* | 99 | 19 192,05 | 1 000,00 | 2 601,83 |
| 4 | пер. Луговому 2-й (участок № 2) | 340100000008005093 | 0,1045 | | | 99 | 13 370,46 | 400,00 | 2 560,06 |
| 5 | пер. Луговому 2-й (участок № 3) | 340100000008005094 | 0,1059 | | | 99 | 13 549,58 | 400,00 | 2 511,49 |
| 6 | пер. Луговому 2-й (участок № 7) | 340100000008005529 | 0,1500 | | | 99 | 22 469,37 | 1 000,00 | 1 501,47 |
| 7 | пер. Луговой 2-й (участок №9) | 340100000008005143 | 0,1500 | | | 99 | 19 192,05 | 1 000,00 | 1 568,06 |
| 8 | по ул. Индендантской, 1А | 340100000003003312 | 0,1879 | для строительства и эксплуатации здания административно-хозяйственного | охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, канализации | 5 | 21 770,37 | 1 000,00 | 2 838,06 |
| 9 | по ул. Объездной, 1 | 340100000005007267 | 2,8215 | для строительства и обслуживания объекта производственного назначения | ограничений в использовании нет | 5 | 87 024,79 | 4 500,00 | 4 520,36 |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфоструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3-6, № 3-14).
3. **Аукцион состоится 2 октября 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Необходимые документы: 4.1 граждане - копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
6. По желанию граждан, Организатор аукциона осуществляет показ земельного участка на местности.
7. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
8. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр»** с 31 августа по 30 сентября 2019 г. включительно. **Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**
Контактные телефоны: +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by

## 12 сентября 2019 года в 13.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров «ОАО «Элегант»

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об участии в иных обществах.
2. О совершении сделок общества.
3. О внесении и утверждении изменений в Устав ОАО «Элегант».

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 12.30 до 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).
Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 2 сентября 2019 г.
Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 05.09.2019 г., по месту нахождения общества.

УНН 400078331.

**ПРОДАЕТСЯ ДОМ по адресу: Гродненская область, Сморгонский район, д. Ордаши. Недорого. Тел. 8-029-828-90-13**

## Извещение о проведении повторного аукциона

**Аукцион состоится 11.09.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 11, к. 218.**
**Организатор аукциона:** унитарное предприятие «Минское отделение БелТПП», 220113, г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 65, к. 3, тел. +37517 3500461. Сайт – www.tppm.by, e-mail: zhuk@tppm.by.
**Продавец: ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты»**, 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 95, тел. 8 (0177) 73 60 31.
Заявления с необходимыми документами на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.30, в пятницу до 16.15 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Коммунистическая, 11, к. 203. Сайт организатора аукциона для ознакомления с документами: www.tppm.by.
Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами 10.09.2019 до 13.00. Заключительная регистрация участников аукциона 11.09.2019 с 08.30 до 11.00. С предметом аукциона можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в аукционе. Местонахождение предмета аукциона (объектов): Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107А

| **ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА** |
|---|
| Объекты расположены на одном земельном участке (кадастровый номер 620850100014000853) и включают в себя:<br>**капитальное строение** (наименование – блок очистных сооружений с компрессорной) общей площадью 2475,6 м$^2$ с инвентарным номером 610/С-15671, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107А;<br>**капитальное строение** (наименование – склад брикетирования) общей площадью 573,8 м$^2$ с инвентарным номером 610/С-38011, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107А/3;<br>**капитальное строение** (наименование – здание пилорамы столярного участка РСЦ) общей площадью 656,3 м$^2$ с инвентарным номером 610/С-60318, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107А/2;<br>**капитальное строение** (наименование – склад) общей площадью 542,3 м$^2$ с инвентарным номером 610/С-60540, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107А/1;<br>**многолетние насаждения** (15 шт.) |
| Начальная цена отчуждения на аукционе, без НДС – 1 739 764,11 бел. руб.<br>Сниженная цена отчуждения на аукционе, без НДС – 1 045 418,47 бел. руб. |
| Сумма задатка, без НДС – 104 541,84 бел. руб. |

Подробное описание объектов указано на сайте организатора аукциона: www.tppm.by.
**Задаток перечисляется** на расчетный счет унитарного предприятия «Минское отделение БелТПП», УНП100144204, расчетный счет: (IBAN) BY28 BELB 3012 1064 5100 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», код банка – (BIC) BELBBY2X. Адрес банка: г. Минск, пр-т Победителей, 29.
**Шаг аукциона: 5 %** от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. Первая объявленная цена определяется в соответствии с шагом аукциона к сниженной цене продажи предмета аукциона. Победителем признается участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями иных лиц.
**Условия продажи**: **заявленные объекты реализуются одним лотом**. Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения аукциона. Условия оплаты: 100 % предоплата, если иное не согласовано сторонами письменно. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. Объект продается с условием: покупатель обязан в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня покупки Объекта или иной, письменно согласованный с Продавцом срок, своими силами и за свой счет установить по границе земельного участка, разделяющей территории Продавца и Покупателя, ограждение территории (высота – 3 метра, непрозрачное, с установкой на ограждении колючей проволоки «Егоза»).
Первое извещение о проведении торгов по указанному имуществу было опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.2019. Повторное извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 17.08.2019.



# ЦЯПЕР НЕ ФАНТАН

**Але ж сучасныя тэхналогіі здабычы нафты адкрываюць неверагодныя магчымасці і перспектывы. Пра іх даведалася наш карэспандэнт, якая паднялася на буравую і адчула водар чорнага золата Беларусі.**

**Начальнік Светлагорскага ўпраўлення буравых работ РУП ВА «Беларуснафта» Віктар АРХІПЕНКА** праводзіць экскурсію для журналістаў на пляцоўцы ў Хойніцкім раёне, дзе цяпер распрацоўваецца свідравіна № 23 Карташоўскага радовішча:

— Радовішча тут маладое. Яно адкрыта нядаўна, у 2013 годзе. Цяпер тут толькі 11 свідравін. Аб'ём вымаемых запасаў складае каля 580 тысяч тон нафты. Гэта толькі тое, што разведана. Здабыта каля 18 %, ці 100 тысяч тон. Наперадзе яшчэ гады работы. У нас 22 буравыя ўстаноўкі, і толькі мы займаемся бурэннем нафтавых радовішчаў у Беларусі. Робім у год 50 свідравін, з якіх штогод здабываецца каля ста тысяч тон нафты.

Свідравіна глыбінёй 4400 метраў бурыцца прыкладна за чатыры месяцы. Тая, на якой мы пабывалі, будзе ўводзіцца ў эксплуатацыю прыкладна праз месяц. Кабіна аператара буравой не разлічана на гледачоў. Але ж вельмі цікава было пабачыць, як з дапамогай джойсціка Віталь Башылаў кіруе працэсам угрызання ў глыбіні зямныя.

Чарговая вялізарная труба быццам лёгка аддзяляецца ад астатніх і пачынае акуратна спускацца зверху. Яе шлях працягнецца прыкладна на тры кіламетры ва ўлонне зямлі і накіруецца да месца, дзе будзе забой свідравіны. Рабочыя тут высокакваліфікаваныя — выкарыстоўваецца самае сучаснае беларуска-італьянскае абсталяванне. Персаналу дапамагае розум магутных камп'ютараў. «Мозг» буравой — серверная займае асобныя пакоі ў цокалі ўстаноўкі.

Ёсць тут і «кроў» свідравіны. Так называюць, між іншым, вадкасць, якая запампоўваецца ў свідравіну, а потым уздымаецца з глыбіні нетраў. З выгляду — звычайны бруд. Яго запампоўваюць у спецыяльныя вялізныя ёмістасці, каб вывучаць састаў рэчываў і па ім арыентавацца ў далейшым працэсе бурэння.

Дэгустацыя нафтавага «парфюму» чакае нас унізе. Вадкасці ў прыгожых невялічкіх колбачках адрозніваюцца не толькі подпісам — з якога радовішча прывезены. Яны маюць зусім розныя колер і водар. Тут жа ўзоры керну.

Гэта горная парода, якую дасталі спецыяльным абсталяваннем са свідравіны. Па выглядзе і ўласцівасцях гэтых камянёў спецыялісты даведваюцца пра наяўнасць ці адсутнасць вуглевадародаў у пародзе. З асобных, багатых на вуглевадароды ўзораў керну пад сонцам выступаюць тлустыя чорныя кропелькі. Такія пароды з'яўляюцца калектарамі нафты.

Дарэчы, сёлета беларуская нафтавая галіна адзначае 55-годдзе. У 1964 годзе свідравіна № 6 Рэчыцкага нафтавага радовішча літаральна зафантанавала чорным золатам. Так была пацверджана наяўнасць прамысловых запасаў нафты ў БССР.

Між тым легендарная свідравіна дагэтуль дае чорнае золата. Яна — самы ганаровы член клуба мільянераў з існуючага фонду «Беларуснафты». Усяго такіх свідравін 15. **Начальнік нафтагазаздабыўнога ўпраўлення «Рэчыцанафта» Сяргей СТЭЛЬМАШОК** падрабязна расказвае аб самым буйным радовішчы ў краіне — Рэчыцкім:

— Яго пачатковыя геалагічныя запасы складаюць 95 мільёнаў тон. Пачатковая вымаемасць склала 45 мільёнаў тон. На сённяшні дзень астаткавая — 10 мільёнаў тон. За ўвесь тэрмін эксплуатацыі — а гэта 55 гадоў — мы здабылі з гэтага радовішча 35 мільёнаў тон нафты. Пры гэтым толькі тут прабурана больш за 400 свідравін. Палова з іх знаходзіцца ў эксплуатацыі і дагэтуль даюць нафту. Штогод тут здабываецца каля 500 тысяч тон сыравіны.

Дарэчы, на тэрыторыі нашай краіны адкрыта 85 радовішчаў нафты, а ў эксплуатацыі зараз знаходзіцца 61. Усяго цяпер у эксплуатацыйным фондзе 849 свідравін.

Гэта некалі нафта фантанавала і яе атрымлівалі па некалькі сотняў тон у суткі. Цяпер лічыцца нядрэнным вынікам здабыць 5 тон. Напрыклад, з той жа легендарнай Рэчыцкай свідравіны № 6. Праўда, для гэтага трэба спачатку адпампаваць 200 тон вадкасці, 96 % якой складае вада. Такая нафта лічыцца цяжка вымаемай. Спецыяльныя спосабы дазваляюць атрымліваць такую нафту з найменшымі затратамі.

Між тым беларускія тэхналогіі і спецыялісты запатрабаваны не толькі на радзіме. Сёння прадпрыемствы РУП «Беларуснафта» паспяхова рэалізуюць разнастайныя праекты ў Венесуэле і Эквадоры, Расіі і Украіне.



Цэнтральны пункт кіравання на ўстаноўцы падрыхтоўкі нафты.

На Рэчыцкім радовішчы мы сустракаемся з Наталляй Магілевіч. Яна трымае ў руках здымак, зроблены ў далёкім 1967 годзе, калі яе дзявочае прозвішча было Севярынец. З фота шчыра ўсміхаецца маладая прыгожая дзяўчына ў рабочай вопратцы, якая трымае колбу з нафтай.



Дэгустацыя водару нафты.

— Тады я выпадкова стала гераіняй усяго Саюза, — Наталля Сямёнаўна і сёння хвалюецца, калі ўспамінае тыя даўнія часіны. — Фота сімвалізавала мільённую тону здабытай нафты. Гэта было свята. Фотакарэспандэнт запрасіў мяне ўзяць колбу з нафтай і стаць мадэллю. Потым здымак быў апублікаваны ў розных газетах і часопісах...



Нафта здабываецца з вадкасці, якая на 96 % складаецца з вады.

20-гадовая фотамадэль была ў той час звычайнай лабаранткай хімічных аналізаў. Цяпер ужо 37 гадоў працоўнага стажу ў галіне за плячыма і той жа вясёлы агеньчык у вачах.

Начальнік НГЗУ «Рэчыцанафта» Сяргей Стэльмашок нагадвае пра яшчэ адну памятную старонку гісторыі прадпрыемства. У 1965 годзе, калі быў уведзены ў эксплуатацыю Рэчыцкі ўзбуйнены нафтапромысел (потым нафтагазаздабыўное ўпраўленне «Рэчыцанафта»), першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў адкрываў умоўную засаўку, каб і беларускія вуглевадароды пайшлі ў нафтапровод «Дружба». Менавіта ў той час была падрыхтавана першая «кандыцыйная» прамысловая беларуская нафта.

Размова, дарэчы, ідзе каля самой установкі падрыхтоўкі нафты, пабудаванай у 1972 годзе.

Пульт кіравання ўстаноўкі — некалькі манітораў, за якімі ўважліва сочаць два спецыялісты. Тут жа адбываецца кантроль за адгрузкай нафты, праводзяцца прыёма-здатачныя аперацыі і афармляецца пашпарт якасці на гатовы прадукт.

Размова непазбежна заходзіць пра перспектывы нафтаздабычы ў нашай краіне. Сяргей Стэльмашок запэўнівае, што мінімум 30 гадоў на тэрыторыі Беларусі яшчэ будуць здабываць чорнае золата:

— Хоць стан рэсурснай базы і пагаршаецца, мы прырастаем у здабычы нафты. У 2018 годзе ўпершыню ў гісторыі прадпрыемства гадавы аб'ём здабытай нафты перавысіў 1 мільён 670 тысяч тон. Пры гэтым новыя свідравіны далі больш за 94 тысячы тон нафты. Гэта найлепшы вынік за апошнія 23 гады. І ўпершыню за 20 гадоў прырост запасаў нафты ў Беларусі дасягнуў узроўню здабычы. Налета таксама будзем усё рабіць для таго, каб прырошчваць аб'ёмы здабычы. Гэтаму садзейнічае ўкараненне новых тэхналогій. Пастаянна ідзе сейсмічная разведка нафтавых рэсурсаў на тэрыторыі Беларусі. Дарэчы, чатыры гады таму на Рэчыцкім радовішчы быў адкрыты Ланскі залеж, пра які спачатку нават геолагі і прамыслоўцы не падазравалі. З развіццём тэхналогій пошуку вуглевадародаў мы падыдзем да новых магчымасцяў, якія нам дазволяць працягваць здабычу нафты на беларускай зямлі і праз 30 гадоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


## Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009274, площадью 0,0882 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Прибережная, в районе дома 8 (участок № 4) для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина); охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена:** 18 522,00 бел. руб. Задаток: 1852,20 бел. руб. |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009271, площадью 0,1300 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 9, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона линий электропередачи. **Нач. цена:** 25 181,00 бел. руб. **Задаток:** 2 518,10 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 20.09.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 02.09.2019 по 19.09.2019 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009277, площадью 0,1143 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Шевардиновская, 2А, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи. **Нач. цена:** 22 139,91 бел. руб. **Задаток:** 2 213,99 бел. руб. |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009615, площадью 0,1362 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 2-я Набережная, 5А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина). **Нач. цена:** 31 571,16 бел. руб. **Задаток**: 3 157,11 бел. руб. |
| **Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009281, площадью 0,1433 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 2-я Набережная, 5Б для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина). **Нач. цена:** 33 216,94 бел. руб. **Задаток:** 3 321,69 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.10.2019 в 15.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 02.09.2019 по 30.09.2019 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |

**Реквизиты для внесения задатка: р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л №200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386,** получатель платежа: Витебский горисполком. Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь).

**Условия аукционов:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права, ограничения (обременения) на зем.участок в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и одного года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Рассрочка оплаты земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Витебского горисполкома № 472 от 14.04.2010 г.

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт.тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

# НА АДНЫМ ДЫХАННІ

## Пра музыку, жаноцкасць і крыху чараўніцтва

**Яны спяваюць на розных мовах: беларускай, рускай, польскай, англійскай... нават на японскай. Але галоўную славу гэты жаночы калектыў здабыў дзякуючы эстраднаму гучанню беларускіх матываў. У 80-х кампазіцыі «Чараўніц» — «Пах чабаровы», «Не за вочы чорныя», «На новае лета» — гучалі, даруйце за банальнасць, з усіх прасаў, вокнаў, радыёкропак. Але ў цяжкія 90-я, калі многім у пошуках заробку было не да творчасці, калектыў распаўся. І знік з далягляду на доўгія 20 гадоў.**
**А ў новым стагоддзі вярнуўся — не столькі на хвалі настальгіі, колькі таму, што аказаўся патрэбны гледачам. Пра творчыя пошукі і гастрольныя ўспаміны, новае пакаленне «дзяўчат з дудкамі» і пра тое, як захаваць фірменнае «чараўніцтва» на працягу 45 гадоў, гутарым з цяперашнімі ўдзельніцамі вакальна-інструментальнага ансамбля — Палінай Базылевай, Анжалікай Зайцавай, Вольгай Макушынскай, Наталляй Лукашэвіч (трамбон), Святланай Рагула і Дар'яй Бабко (абедзве — саксафаністкі).**



### Дасье «Звязды»

*Першы беларускі жаночы ВІА стварыў мужчына, Генадзь Лятынскі. У 1971 годзе ў Гродне пры ДК тэкстыльшчыкаў музычны кіраўнік сабраў таленавітых дзяўчат, неабыякавых да народнай песні, і дадаў да абавязковага на той час набору (гітара, рытм-секцыя і клавішы) духавыя інструменты. «Дудкі» — флейты, саксафоны, трамбон і нават труба — сталі адной з галоўных адметнасцяў «Чараўніц». Літаральна праз некалькі гадоў іх заўважылі і запрасілі ў Мінск — у штат Белдзяржфілармоніі. Якраз жнівень 1974-га лічыцца афіцыйным днём нараджэння ансамбля, які скараў адну за адной усё новыя вяршыні: перамога на Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады (1979), маскоўская Алімпіяда 1980-га, Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Пхеньяне (1989). І, натуральна, мноства гастроляў: ад Камчаткі да Байканура, ад еўрапейскіх краін да афрыканскага кантынента, ад Чарнобыльскай зоны да шпіталяў у Афганістане...*

Сабрацца наноў — такія планы былі, але ўсё неяк не выпадала: адны ўдзельніцы выйшлі замуж і пераехалі ў іншую краіну, другія змянілі сцэнічную прафесію на больш зямныя, некаторыя наогул адышлі ад музыкі. А ў 2010-м не стала першага кіраўніка «Чараўніц» Генадзя Лятынскага, і, здавалася, каму ўжо гэта трэба... Аказалася — трэба.

— Я пражыла ў Расіі 15 гадоў, але вярнулася ў Беларусь, — згадвае музычны кіраўнік і салістка ансамбля Вольга Макушынская, — наша Света Рагула працягвала іграць на саксафоне і спяваць, а ўсе астатнія ўдзельніцы, з кім адраджалі калектыў, былі педагогамі ў школах — то-бок звязаныя з музыкай, але па-за сцэнай, таму вяртацца, натуральна, было страшнавата. Але разам з тым так захацелася сабрацца наноў, што, напэўна, патрэбны быў адзін толькі штуршок.

***— Праўда, што ў 2011 годзе Надзея Мікуліч проста паставіла вас перад фактам: дзяўчаты, круціцеся як хочаце, выступаеце на маім канцэрце?***

— Так і было. Яна патэлефанавала і сказала: «У мяне бенефіс, запрашаю вас як гасцей — зрабіце хоць адну песню». Выбралі гэту: «Ты мяне над крыніцаю называў чараўніцаю», — а Надзея знайшла і паказала на экране архіўны запіс, дзе мы яшчэ маладыя спяваем тую самую песню. Зала апантана падтрымлівала нас. І якраз убачыўшы гэту рэакцыю, паглядзеўшы на тое, як адзін за адным з нябыту адраджаюцца старыя калектывы, мы падумалі: значыць, прыйшоў час і нам вярнуцца. Аднавілі «Пах чабаровы» і «Ручаёчак, ручаёк» — знакавыя песні, па якіх калектыў пазнавалі і якія нам самім падабаліся. Справа пайшла: нас пачалі запрашаць на пару нумароў, потым на паўгадзіны... («А цяпер на дзень, пакуль песні не скончацца!» — смяюцца сяброўкі). Далей разнасталі праграму джазрокам у стылі вядомага ансамбля Chicago, і сёння гэта таксама наша «фішка». Падкрэслю, мы — не «папса», а эстрада, калі хочаце, фолькрок у сучаснай апрацоўцы.

***— Кажуць, за савецкі час праз калектыў прайшло не менш за 20 удзельніц...***

— Значна больш! — запэўніваюць дзяўчаты. — Помніцца, выступалі не менш за дзесяць чалавек на сцэне. Разумеюцы, што склад будзе змяняцца, бо ўдзельніцы выйдуць замуж і народзяць дзяцей, Генадзь Лятынскі настойваў, каб кожная асвойвала адзін-два інструменты і магла замяніць іншую.



Святлана Рагула згадвае: яна прыйшла ў ансамбль як піяністка, клавішніца, а ў выніку асвоіла саксафон — і шмат гадоў з ім не расстаецца, захоўваючы ўдзячнасць кіраўніку за адчуванне адценняў і нюансаў розных музычных стыляў; Людміла Пасмурцава іграла на домры, потым паспрабавала бас-гітару і дайшла да трубы.

45-годдзе ансамбль адзначыць, як водзіцца, на канцэрце, куды запрасілі многіх былых удзельніц. Назвалі праграму сцісла і ёміста — «Назаўжды». «Бо няма былых «Чараўніц», — тлумачыць мастацкі кіраўнік — дырэктар ансамбля Паліна Базылева, — кожная з дзяўчат, якая мела дачыненне да ансамблю, нясе ў душы яго часткі і, я перакананая, лічыць сябе трошкі чараўніцай. Так што канцэрт будзе падарункам і ім, нашым папярэдніцам, і нашым слухачам, і ўсім тым, хто з намі і супраць нас, — «назаўжды» ў сэнсе «не дачакаецеся»! Запрасілі Надзею Мікуліч; на сцэне з намі выступяць народная артыстка Беларусі Ядвіга Паплаўская, заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, гурт «Спадчына», Яўген Курчыч і гурт «Маракасы», а яшчэ мадэльная школа ELEN Fashion school. Словам, 5 верасня ў ПК чыгуначнікаў будзе не толькі юбілейны канцэрт, але і шоу са святлодыёднымі экранамі, і дызайнерскі паказ калекцыі адзення «Перапінак» — усіх сакрэтаў пакуль раскрываць не будзем.

Раней слухачы цікавіліся, дзе можна знайсці вінілавыя пласцінкі і рарытэтныя запісы «Чараўніц», сёння — дзе можна спампаваць іх песні. «Мы ёсць на YouTube, на ЯндэксМузыцы і нацэлены не на тое, каб прадаваць дыскі, а на тое, каб прасоўваць кожную канкрэтную песню — зняць для яе відэа і зрабіць прыгожую вокладку, — расказвае Паліна Базылева. — Нас можна знайсці практычна на ўсіх вядучых музычных платформах і ў сацсетках». А калі папросяць, можна адшукаць і рэтра-запісы — кантэнт-менеджар Васіль Ліхтаровіч, які працуе з калектывам, вядзе своеасаблівы летапіс ансамбля, знаходзячы і захоўваючы старыя пласцінкі, фатаграфіі і відэазапісы, у тым ліку вельмі рэдкія.

***— «Пах чабаровы» — безумоўны хіт, візітоўка ансамбля. А якія песні ў рэпертуары любімыя ў вас?***

— Назаву «Тюрю», — адказвае Дар'я Бабко. — Ніколі б не падумала, што пастаўлю ў плэер песню, якую сама выконваю, але гэта якраз той выпадак. Сучасная аранжыроўка, вельмі модны цяпер стыль брас — пападанне ў маладзёжную аўдыторыю на 100 працэнтаў.

— Для мяне нумар адзін — «Не за вочы чорныя». Яна быццам з майго мужа спісаная, і кожны раз, спяваючы, думаю пра яго, — усміхаецца Анжаліка Зайцава.

— Калі толькі прыйшла ў калектыў, мяне да глыбіні душы ўразіла «Марыся» на словы Янкі Купалы — яе спявала Маша Высоцкая, у якой было вельмі высокае каларатурнае сапрана, выходзячы на трэцюю актаву... Атрымлівалася на дзіва пяшчотна і прыгожа. З гэтай песняй я і на гітары вучылася іграць, і неяк на жыцці менавіта яна мяне вядзе, — зазначае Вольга Макушынская, — таму ў найноўшую гісторыю «Чараўніц» мы яе таксама ўзялі.

— Люблю «Каліну-маліну» і «Не пытайся, маці», а таксама «Крынічаньку» — адна з іх народная, дзве другія напісаныя вядомым кампазітарам Эдуардам Зарыцкім. Яны захоўваюць той самы «чараўніцкі» дух, але маюць сучаснае гучанне, — пералічвае Святлана Рагула. — Так што мы не выязджаем толькі на старым, савецкім рэпертуары — абнаўляецца і сам калектыў, і наша музыка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і з архіва ансамбля.**

### А яшчэ быў выпадак...

❍ Гастролі на Далёкім Усходзе — нібы паездка на іншую планету, — расказвае Вольга Макушынская. — Вулканы, сопкі, цябе ўвесь час крыху хістае... Аднойчы на Камчатцы ў нас за тры дні было дзевяць канцэртаў, гэткі канвеер. А трэба было пераапранацца двойчы на кожным з канцэртаў, і пакуль вядучы Валера Бескаравайны займаў пару хвілін, мы часам страчвалі пачуццё часу і месца.

— І потым многім з дзяўчат яшчэ сніліся кашмары, як барабаншчыца пачынае ўжо сваю партыю, а яны не паспяваюць пераапрануцца, — дадае Святлана Рагула.

— Пра кіжуча, якога везлі дадому ў Беларусь у чахлах ад музычных інструментаў, — байка ці рэальны выпадак?

— Рэальны! — смяюцца артысткі. — Рыбіна была такога памеру, што нікуды не ўмяшчалася, а вось у футляр бас-гітары якраз улезла. І вось уваходзім мы ў салон самалёта, а рыба ж пахне! А нам яшчэ трэба ў Маскве перабрацца на Беларускі вакзал і сесці на цягнік, і вось мы такой «араматнай кампашкай», але ўсё адно шчаслівыя, ехалі да Мінска. Затое на навагодні стол — а справа была акурат перад святам — прывезлі родным дэфіцытную рыбу. Святлана, якая жыла ў інтэрнаце музвучылішча, паставіла на стол вялікі слоік з ікрой, а тут якраз абход адміністрацыі. Дырэктар вучылішча ажно страціў дар маўлення, а вочы, відаць, так на стале і пакінуў...

❍ Сярод яркіх гастрольных успамінаў — Афрыка, дзе «Чараўніцы» не толькі адыгрывалі сваю праграму, але і акампаніравалі Анатолю Ярмоленку і Віктару Вуячычу. Дзяўчат абавязалі выступаць у нацыянальных касцюмах — шарсцяных (!) спадніцы, кашулі з камізэлькамі — а ў зале, як і на вуліцы, 40-градусная спёка, і пра кандыцыянеры яшчэ ніхто не чуў. «Калготкі немагчыма было нацягнуць, бо ногі мокрыя, ты спрабуеш хоць неяк сабрацца, спяваць для канкрэтнага гледача ў зале — а нікога не бачыш, бо ўсе чорнаскурыя, у вачах літаральна цёмна...»

❍ На так званых «зялёных» канцэртах (апошнія выступленні ў нейкім горадзе ці наогул у гастрольным туры), у адрозненне ад звычайных праграм, выканаўцам дазваляецца жартаваць адно з адным. Казусаў хапала: то за спінай салісткі іншыя дзяўчаты раптам пачынаюць іграць «сем сорак», то калкі на бас-гітары «добрыя» людзі падкруцяць у роўную лінію і настройваць інструмент даводзіцца проста падчас канцэрта, то барабанныя палачкі схаваюць альбо паперкі ў саксафон падкінуць. «Але самы вялікі рогат у мяне дагэтуль выклікае песня «Стары матыў», словы якой забылася наша салістка, так і спявала два куплеты адно і тое ж: «Стары матыў, стары матыў, ён вельмі-вельмі стары...» — расказвае і паказвае ў асобах Вольга Макушынская. — Духавыя, якім трэба было выйсці толькі ў сярэдзіне песні, сыграць туці і пайсці, рагочуць за кулісамі. У барабаншчыцы ўжо туш цячэ ад слёз, мы з клавішніцай паварочваемся бокам, каб не было бачна скрыўленыя грымасай смеху твары, а ў нашай Веры ад стрэсу ўжо літаральна ногі трасуцца... І калі ў другім прыпеве выходзяць чатыры дзяўчыны з дудкамі, то сыграць змагла адна труба — Люда Пасмурцава, астатнія літаральна рохкалі, бо ад смеху не маглі набраць як след паветра ў лёгкія. Пасля выступлення Вера ад душы выказалася: «Сволачы вы ўсе, я ад страху ледзь не знепрытомнела!». У антракце бачу ўкурыцы нашага гукарэжысёра Барыса, пытаюся, маўляў, ну як мы, а той кажа: нармальна, толькі «Стары матыў» атрымаўся нейкі вясёлы. Пасля гэтага я зразумела, што далёка не заўжды людзі слухаюць тэкст і не ўсе «ляпы» публіка заўважае, так што памылкі на сцэне — гэта не крымінальна, галоўнае сабрацца і працягваць выступленне».

Выстаўка

# СЛЕД МАЛАДЫХ. РУХ?

## Трыенале як паказчык творчага мыслення



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Усё ёсць — мастацтва ў розных жанрах аб'ядналі першы конкурс для маладых мастакоў, арганізаваны дзяржавай і шэрагам творчых устаноў. Усё, што было адметнага ў нашым мастацтве, удзельнікі конкурсу нагадалі. Што далей? — задаюцца пытаннямі спецыялісты, таму што будучыню вызначае здольнасць мысліць інакш і прапаноўваць інавацыйныя рашэнні творчых задач.**

Вось самы галоўны клопат: рух ёсць там, дзе ёсць пошук і жаданне рабіць не так, як папярэднікі, але і прафесійнасць у мастацтве выключыць немагчыма. Экспазіцыя першай Трыенале маладых мастакоў атрымалася даволі традыцыйная, як і большасць таго, што прапаноўваецца гледачу. Можа, у гэтым уся справа: моладзь хоча спачатку займець гледача, а потым будзе думаць пра тое, як яго здзіўляць?

— Для кожнага мастака важна, каб яго твор быў прыняты гледачом, — адзначыла **першы намеснік міністра культуры Наталля КАРЧЭЎСКАЯ.** — Мы і далей будзем надаваць увагу творчасці маладых таленавітых мастакоў. Я шчыра жадаю, каб шмат для каго гэтая выстаўка стала адпраўным пунктам, ад якога пойдзе далейшы шлях, у тым ліку і каб годна прадстаўляць Беларусь на сусветных пляцоўках.

Але пакуль варта вызначыцца ў арыенцірах: што добрага маем, і чаму яно добрае. Журы было няпроста, як адзначыла яго **старшыня кандыдат мастацтвазнаўства Ірына СКВАРЦОВА,** у некаторых намінацыях пераможцаў вырашылі не называць наогул. І, як ні дзіўна, зусім не таму, што была надта высокая канкурэнцыя. Старшыня журы звярнула ўвагу на жаданне нашай моладзі ісці пратораным шляхам. Вось і работы пераможцаў у намінацыі «Жывапіс» пра гэта сведчаць, бо зроблены дабротна: Алена Вярстак і пяць яе твораў «Пра з'яўленне» арыгінальныя хіба што спробай стварыць дынаміку ўспрымання чалавечай асобы. Ляўкас пераможцы ў другой групе Крысціны Мельнік «Звеставанне» — увасабленне традыцыйных каштоўнасцяў беларускай культуры.

Крытычна паставілася журы да прэтэндэнтаў на перамогу ў намінацыі «Графіка». У першай групе пераможцаў не назвалі наогул, лаўрэат вызначаны ў другой групе — Марыя Кошалева і яе работы з серыі «Танец». **Адзін з членаў журы Андрэй БАСАЛЫГА,** які калісьці атрымаў Гран-пры на імпрэзе «Новыя імёны», зладжаной Саюзам мастакоў Беларусі, лічыць:

— Беларуская школа графікі вельмі моцная, яна вядомая і ўплывае на шмат плыняў графікі ў свеце. Але менавіта таму журы вельмі крытычна паставілася да кандыдатаў. Трэба быць больш вольнымі, больш смелымі, уражлівымі, здольнымі ламаць стэрэатыпы.

Як ні дзіўна, іх хочуць ламаць дзяўчаты — ужо тым, што выбіраюць спецыяльнасці, у якіх традыцыйна дамінавалі мужчыны. **Выкладчык кафедры скульптуры БДАМ Канстанцін КАСЦЮЧЭНКА** адзначыў, што апошнім часам дзяўчаты ўступаюць у працу з каменем і металам. Вось і вынікі таму падцвярджанне: Аляксандра Рыбалка атрымала перамогу дзякуючы твору «Малітва». Праўда, Антон Нічыпарук стаў пераможцам у другой групе дзякуючы рабоце ў бронзе «Эрозія» — у ёй ёсць вобраз і нейкі ўнутраны рух, чаго ў творах маладых наогул бракавала.

— На жаль, так бывае, што мастакі, якіх на пачатку іх шляху хвалілі, потым нічога не паказваюць, — выказаў меркаванне **загадчык кафедры малюнку акварэлі і скульптуры БНТУ прафесар Мікалай КІРЭЕЎ.** — Спадзяюся, што сёлетнія лаўрэаты не стануць працягам гэтай тэндэнцыі... Смеласці не хапае, дзёрзкасці не хапае. Вельмі шмат прыкладаў, якія ўжо былі паказаныя іншымі мастакамі на іншых выстаўках. Мы ўсім жадаем поспехаў, але яны не з'яўляюцца самі па сабе, яны вырастаюць унутры кожнага мастака.

Вось і ў намінацыі «Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» пераможца выяўлены толькі ў першай групе: Ганна Плотнікава. Удзельнікаў у намінацыі «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» таксама крытыкавалі за эксплуатацыю напрацовак папярэднікаў. Тым не менш у першай групе гэтай намінацыі адзначылі Вікторыю Тарасевіч з пластычнай кампазіцыяй «Жыццё прасторы». У другой групе — Наталлю Шкрабу з яе керамічнай гісторыяй у малюнках.

І ўсё ж небанальнасць варта адзначаць, нават калі знаўцам яна здаецца адноснай. Дар'я Сямчук, якая выстаўлялася пад творчым псеўданімам Цемра, выказалася на тэму культурных трэндаў. Чорны прамавугольнік з лагатыпам Adidas у пафаснай рамцы — гэта алюзія сучаснай культуры сёння і яе прыярытэтаў. Нельга сказаць, што думка (і нават выяўленне) надта новая, але ў вялікай экспазіцыйнай прасторы твор усё ж такі вылучаўся хутчэй жаданнем арыгінальнасці. Журы прысудзіла спецыяльны дыплом: за абуджэнне думак і разваг, чаго звычайна і чакаюць ад мастацтва.

| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ними | **Лот 1.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-671163. Наименование: помещение неустановленного назначения. Назначение: помещение неустановленного назначения; общая площадь – 5,9 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 306А – 1 476,00 руб.<br>**Лот 2.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691467. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду; общая площадь 3,6 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 200Т – 1 108,00 руб.<br>**Лот 3.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-686684. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду; общая площадь 1,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 234Т – 376,00 руб.<br>**Лот 4.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691469. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду; общая площадь 3,6 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп.1, пом. 300Т – 1 108,00 руб.<br>**Лот 5.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691472. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду; общая площадь 7,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 402Т – 1 884,00 руб.<br>**Лот 6.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691471. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Общая площадь 2,4 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 440Т – 648,00 руб.<br>**Лот 7.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691474. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Общая площадь 4,6 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 536А – 1 084,00 руб.<br>**Лот 8.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691475. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Общая площадь 2,1 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 539А – 520,00 руб.<br>**Лот 9.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691476. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Общая площадь 3,9 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 539Т – 908,00 руб.<br>**Лот 10.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-691477. Наименование: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Назначение: вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду. Общая площадь 5,3 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 540Т – 1 300,00 руб.<br>**Лот 11.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-708030748. Наименование: кладовая. Назначение: помещение неустановленного назначения. Общая площадь 7,7 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45-742 – 548,00 руб.<br>**Лот 12.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-708030752. Наименование: кладовая. Назначение: помещение неустановленного назначения. Общая площадь 7,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45-746 – 660,00 руб.<br>**Лот 13.** Изолированное помещение с инв. № 500/D-708030753. Наименование: кладовая. Назначение: помещение неустановленного назначения. Общая площадь 5,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45-747 – 472,00 руб.<br>**Лот 14.** Не завершенный строительством не законсервированный объект. Наименование: Гараж-стоянка на 45 машино-мест; расположено по адресу: г. Минск, в границах ул. Мележа (пр-т) – Л. Беды – Мелиоративная – Литературная; расположено на земельных участках с кадастровым № 500000000008006576; 500000000008005763; 500000000008005762 – 207 900,00 руб.<br>**Лот 15.** Не завершенный строительством не законсервированный объект. Наименование: многоэтажная открытая гараж-стоянка на 230 машино-мест с помещениями сопутствующего назначения. Расположено по адресу: г. Минск, ул. Яна Чечота. Расположено на земельном участке с кадастровым № 500000000005006461 – 375 900,00 руб.<br>Ознакомиться с предметами лота можно с 10.00 в рабочее время, предварительно позвонив по тел. +37544-734-16-96, Григорий Николаевич, гор. тел. +37517 237-27-32 |
| Порядок проведения торгов | Торги состоятся 16 сентября 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5 корп. 1, комн. 540. Сумма шага: 5 %. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 (пяти) банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов и наличия платежных реквизитов для возврата денежных средств. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 5 дней до даты их проведения |
| Размер задатка для участия | Задаток – 9 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY34BPSB3012104554016933 0000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC- BPSBBY2X, УНП 100146753 Получатель – ООО «Карпович» |
| Сроки и место приема заявок на участие в торгах | Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 12 сентября 2019 года в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа 5, корп. 1, комн. 540. E-mail – Hotel_inv@mail.ru факс 240-60-12 |
| Документы, необходимые для участия | Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в объявлении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов; для индивид. предпринимателя, копии свидет-ва о гос. регистрации ИП (без нотариального засвидетельствования); для юрид. лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования); для иностр. юридического лица, иностранной орган-ции, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации, легализованных в установленном порядке копий учред. документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах), либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финан. состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования); для пред-ля гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, доверенности, оформленной в соответствии с законодательством РБ. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, в том числе представители юридических лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| Порядок заключения договора | Все расходы по переоформлению имущества возлагаются на покупателя.<br>Победитель торгов оплачивает расходы по организации торгов, которые понесло ЧУП «ОтельИнвест» в размере 80 рублей за организацию каждого лота на следующие реквизиты: р/с BY47BLNB30120000074501000933, код банка BLNBBY2X, в ОАО «БНБ-Банк», УНП 192185481.<br>Заключение договора купли-продажи осуществляется по согласованию с регистратором РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов |

# АМАЗОНІЯ Ў АГНІ



## Як выратаваць унікальную сельву?

**Да маштабных пажараў, якія ўжо больш за месяц палаюць у трапічных лясах басейна Амазонкі, без перабольшвання прыкавана ўвага ўсяго свету. Глабальнае бедства «стала дадатковым стрэсам для клімату і прыроднага асяроддзя Зямлі пасля чэрвеньскіх і ліпеньскіх пажараў у Арктыцы», адзначыла днямі Сусветная метэаралагічная арганізацыя (СМА). Як падлічылі эксперты, за першыя 25 дзён жніўня ў атмасферу трапіла 255 мільёнаў тон двухвокісу вугляроду. СМА спасылаецца на звесткі службы Еўрасаюза па назіранні за атмасферай «Капернік» (CAMS). За гэты час у Амазоніі было зарэгістравана амаль чатыры тысячы пажараў, якія таксама прывялі да выкіду ў атмасферу такіх таксічных газаў, як вокіс азоту і неметанавыя арганічныя злучэнні. Метэаролагі звяртаюць увагу на прамую пагрозу, якую агонь і падобныя выкіды ўяўляюць для карэннага насельніцтва рэгіёна. «Пажары ў Амазоніі сталі працягам беспрэцэдэнтных чэрвеньскіх і ліпеньскіх пажараў у Сібіры і ў раёнах Арктыкі, Грэнландыі і Аляскі», — нагадала СМА. Што ж адбываецца ва ўнікальнай паўднёваамерыканскай сельве?**

### ПОПЕЛЬНЫЯ ДАЖДЖЫ

Амазонская сельва — самы буйны ў свеце трапічны лес. Яна размешчана на шырокай, амаль плоскай раўніне, якая ахоплівае амаль увесь басейн ракі. Межы сельвы выразна акрэслены ўсходнім падножжам Андаў, а таксама схіламі Бразільскага і Гвіянскага нагор'яў. Грандыёзная «зялёнка» займае 5,5 мільёна квадратных кіламетраў — палову агульнай плошчы такіх лясоў на планеце. Яна знаходзіцца на тэрыторыі дзевяці дзяржаў — Бразіліі (найвялікшы кавалак), Перу, Калумбіі, Венесуэлы, Эквадора, Балівіі, Гаяны, Сурынама, Французскай Гвіяны.

Амазонская сельва вылучаецца найбольшай біялагічнай разнастайнасцю на планеце. Гэта прыблізна 40 тысяч відаў раслін, у тым ліку 16 тысяч відаў дрэў, 3 тысячы відаў рыб, амаль 2 тысячы відаў птушак, больш за тысячу відаў млекакормячых, земнаводных і паўзуноў і амаль 130 тысяч відаў розных беспазваночных. Пры гэтым трапічныя лясы басейна Амазонкі з'яўляюцца найбуйнейшай у свеце экасістэмай падобнага тыпу. Тут сканцэнтравана пятая частка запасаў прэснай вады на Зямлі. Лес служыць важным паглынальнікам вугляроду, бо забірае вуглякіслы газ і дапамагае ўтрымліваць рост глабальнай тэмпературы.

Лясы Амазонкі насяляюць каля пяцідзесяці розных плямёнаў. Цяжка ўявіць, але многія з іх жывуць практычна ў поўнай ізаляцыі ад сучаснай цывілізацыі. У іх няма пісьменства, яны захавалі самабытны жыццёвы ўклад продкаў і здабываюць ежу за кошт рыбалкі і палявання. Гэтыя дзікія індзейскія плямёны ў джунглях Амазонкі адрозніваюцца адно ад аднаго не толькі вонкава, яны гавораць на розных мовах, у кожнага свая культура, абрады, адзенне і прычоскі. Згодна з бразільскай канстытуцыяй 1988 года, усе землі старажытных продкаў сучасных індзейцаў павінны былі перадаць родам на працягу пяцігодкі, але гэты працэс дасюль яшчэ не завяршыўся.

У 1980—1990-х гадах плошча лясоў Амазонкі пачала паступова скарачацца, таму што фермеры, шахцёры і лесанарыхтоўшчыкі расчышчалі ўчасткі зямлі для вырошчвання сельскагаспадарчых культур, гадоўлі жывёл ці продажу драўніны. Гэта быў спосаб зарабіць грошы ў рэгіёне з высокім узроўнем беспрацоўя. «Якая схема? Вы прысвойваеце зямлю і прадаяце яе. Зямля даражэе ў 50, 100, 200 разоў, калі на ёй высечаны лес. Гэта выдатны бізнес. Вы прадаяце дзяржаўную зямлю, дакладна, так што гэта — чысты прыбытак», — адзначыў прафесар Федэральнага ўніверсітэта штата Пара Маўрысіа Торэс.

Але паколькі ў Бразіліі ў 1980-х гадах была створана шырокая сетка нацыянальных запаведнікаў і тэрыторый карэнных народаў, стала складана прысвойваць зямлю. У 2000-х гадах, калі аб'ёмы высечак узраслі, урад прыступіў да ажыццяўлення амбіцыйнага плана па запаволенні тэмпаў знішчэння трапічных лясоў. Але гэтыя намаганні, якія ў значнай ступені абапіраліся на агрэсіўныя аперацыі праваахоўных органаў, з часам страцілі сваю папулярнасць. Праблемы ў эканоміцы павялі тысячы беспрацоўных углыб лесу.

Бразільская эканоміка традыцыйна арыентавана на экспарт прыродных рэсурсаў — нафты, руды, збожжа, гародніны, садавіны і мяса, у першую чаргу знакамітай бразільскай ялавічыны. У гэтай сувязі Жаір Балсанару, як і яго папярэднік Мішэль Тэмер, а да іх прэзідэнты-«левыя» Луіс Інасіу Лула да Сілва і Дылма Русеф, кожны ў свой час, шмат казалі пра неабходнасць «разумнага індустрыяльна-аграрнага развіцця Амазоніі». У выніку ўсё абярнулася бескантрольным знішчэннем джунгляў — дзеля палеткаў для вырошчвання маслічных культур і соі, пашы для жывёлы і бурэння свідравін.

Падчас выбарчай кампаніі і пасля ўступлення на пасаду прэзідэнта Балсанару казаў, што абарона трапічных лясоў цяжарам ляжыць на эканоміцы Бразіліі і тармозіць яе развіццё. Найбольшы працэнт галасоў, якія прынеслі яму перамогу на леташніх выбарах, ён атрымаў якраз у трох галоўных «лясных» штатах — Амазонас, Мату-Гросу і Мату-Грос-ду-Сул, дзе ідзе знішчэнне сельвы і развіццё агракультурнага бізнесу. Тут сельскагаспадарчыя фермы і прадпрыемствы наступаюць на амазонскія джунглі, а іх уладальнікі і работнікі знішчаюць унікальныя раслінны і жывельны свет і асяроддзе пражывання архаічных індзейскіх абшчын, якія жылі там тысячы гадоў.



### КАПІТАН БЕНЗАПІЛА

Сёлета са студзеня да жніўня згарэла больш чым 1,8 мільёна гектараў амазонскай сельвы, прытым толькі ў сакавіку агонь знішчыў каля 500 тысяч гектараў лясоў, паведаміў на гэтым тыдні бразільскі Нацыянальны інстытут касмічных даследаванняў. Відэа і фота таго, што адбываецца ў Амазоніі, жудасныя. Высечка лясоў пад пашы і палеткі прывяла да татальнага «высыхання» рэгіёна. Але асноўнай прычынай катастрафічных вогненных валаў, якія бязлітасна выпальваюць вялізныя лясныя масівы на тэрыторыі Бразіліі, а таксама ўжо і Балівіі, Перу, Эквадора, Гаяны, Сурынама, Венесуэлы, сталі наўмысныя падпалы — для расчысткі тэрыторыі, якая прыносіць даход. Буйныя гарады рэгіёна зацягнутыя заслонай густога дыму, тут цёмна, як уначы. Прайшлі чорныя дажджы — вада змяшалася з попелам.

Прэзідэнт Балсанару скептычна ставіцца да пытанняў захавання навакольнага асяроддзя. У ліпені Нацыянальны інстытут касмічных даследаванняў апублікаваў справаздачу, у якой гаворыцца, што за год тэмпы знішчэння лясоў Амазонкі павялічыліся на 88 працэнтаў. Аднак прэзідэнт публічна паставіў пад сумнеў высновы, якія змяшчаюцца ў гэтай справаздачы. «Калі б лес і на самай справе высякалі з такой хуткасцю, то ад яго ўжо нічога не засталося б», — заявіў ён на мінулым тыдні групе міжнародных журналістаў. Балсанару некалькі разоў каментаваў лясныя пажары і абвінавачванні ў свой адрас. «Раней я быў Капітанам Бензапілой. Цяпер я Нерон, які спальвае лес Амазонкі», — іранізаваў ён у адказ на пытанне аб прэтэнзіях эколагаў. Маштабныя вогнішчы, растлумачыў ён, разгарэліся таму, што ў фермераў пачаўся сезон выпальвання лясоў.



На мінулым тыдні, напярэдадні саміту «Вялікай сямёркі» ў Біярыцы, французскі прэзідэнт Эмануэль Макрон заклікаў сусветных лідараў абмеркаваць «надзвычайную сітуацыю» з пажарамі ў Амазоніі. «Наш дом гарыць. Літаральна. Дажджавыя лясы Амазоніі — лёгкія, якія вырабляюць 20 працэнтаў кіслароду на нашай планеце — ахоплены агнём. Гэта міжнародны крызіс», — напісаў Макрон. Адказ Жаіра Балсанару быў імгненны. На яго думку, прапанова Макрона — пачаць абмяркоўваць тое, што адбываецца ў Амазоніі, на сустрэчы лідараў сямі вядучых дзяржаў заходняга свету — з'яўляецца прыкладам «каланіяльнага ладу мыслення». Балсанару таксама адказаў, як цяпер стала модна, у сваім «Твітары»: «Мне шкада, што Макрон спрабуе атрымаць палітычную выгаду за кошт унутраных спраў Бразіліі і іншых краін Амазоніі».

Францыя і Германія заявілі, што не ратыфікуюць гандлёвае пагадненне паміж Еўрасаюзам і краінамі Паўднёвай Амерыкі, пакуль Бразілія не распачне актыўных намаганняў для барацьбы з ляснымі пажарамі ў басейне Амазонкі. Як вядома, у канцы чэрвеня ЕС і краіны Меркасур (аб'яднаны рынак Аргенціны, Бразіліі, Уругвая і Парагвая) пасля перамоў, якія доўжыліся больш за 20 гадоў, заключылі пагадненне аб свабодным гандлі. Для ЕС гэта найбуйнейшае ў яго гісторыі гандлёвае пагадненне, якое адкрывае еўрапейскаму бізнесу дзверы на рынак чатырох краін Паўднёвай Амерыкі з сумарным насельніцтвам 260 мільёнаў чалавек. Для таго каб дагавор набыў сілу, яго павінны ратыфікаваць парламенты кожнай краіны-ўдзельніцы.

### У ЧАКАННІ ЗАЛЕВЫ

У сацсетках актыўна заклікаюць патушыць пажары ў сельве. Хэштэг #PrayforAmazonia (#МалісяЗаАмазонію) надзвычай папулярны. У той жа дзень, што і Макрон, падобны твіт напісаў амерыканскі астранаўт Скот Кэлі: «Я заўважыў розніцу ў Амазоніі паміж сваім першым палётам у 1999 годзе і апошнім, у 2016». Менш лесу, больш падпаленых палеткаў. Дажджавыя лясы Амазоніі вырабляюць больш за 20 працэнтаў сусветнага кіслароду. Нам патрэбны кісларод, каб выжыць!»

У адказ на гэтыя і іншыя падобныя заявы прафесар Універсітэта Каларада Скот Дэнінг апублікаваў артыкул на сайце The Conversation, які так і называецца: «Пажары ў Амазоніі пагібельныя, але яны не спусташаюць запасы кіслароду на Зямлі», перадае Бі-бі-сі. «Часта паўтараюцца сцвярджэнні пра тое, што дажджавыя лясы Амазоніі вырабляюць 20 працэнтаў кіслароду нашай планеты. Яны заснаваныя на непаразуменні, — падкрэслівае прафесар. — Насамрэч, практычна ўвесь кісларод, якім мы дыхаем, вырабляюць акіяны — і яго хопіць на мільёны гадоў».

«Ёсць шмат прычын прыйсці ў жах ад сёлетніх пажараў у Амазоніі, але магчымае змяншэнне запасаў кіслароду на Зямлі — дакладна не адна з іх», — запэўнівае ён. Далей прафесар Дэнінг даволі падрабязна тлумачыць, як менавіта адбываецца кругазварот кіслароду ў прыродзе. Сутнасць яго тлумачэнняў зводзіцца да таго, што дрэвы і іншыя наземныя расліны сапраўды выпрацоўваюць даволі шмат гэтага газу за кошт фотасінтэзу — і прыкладна трэціна яго ўтвараецца ў трапічных лясах, найбуйнейшая колькасць якіх сапраўды знаходзіцца ў басейне Амазонкі. Аднак практычна ўвесь сінтэзаваны раслінамі кісларод паглынаюць арганізмы (пераважна бактэрыі), якія жывуць у тых жа лясах і ў пэўнай ступені пажары, так што «чыстая вытворчасць кіслароду за кошт лясоў, і нават усіх наземных раслін у цэлым, вельмі блізкая да нуля». Той газ, якім мы дыхаем, вырабляе ў асноўным багавінне на паверхні Сусветнага акіяна, а яго рэшткі спажываюць ужо акіянскія бактэрыі і іншыя арганізмы.

У цэлым розніца «штогадовага балансу» паміж вытворчасцю і паглынаннем кіслароду на Зямлі складае тысячныя, калі не мільённыя долі працэнта, тлумачыць вучоны. Аднак гэтага дастаткова, каб за мільёны гадоў існавання жыцця на планеце назапасілася велізарная колькасць свабоднага кіслароду (яго ў атмасферы больш за 20 %), ад якога залежыць усё жывое. «Нават калі ўся арганічная матэрыя на Зямлі згарыць, на гэта пойдзе менш за 1 % сусветных запасаў кіслароду», — запэўнівае Дэнінг і заклікае чытачоў дыхаць на поўныя грудзі. «Нават рэзкі рост колькасці лясных пажараў зменіць кіслародны баланс гэтак нязначна, што гэтыя змены будзе цяжка вымераць. У паветры дастаткова кіслароду, каб яго хапіла на мільёны гадоў, і гэтая колькасць вызначаецца хутчэй геалогіяй, чым тым, як выкарыстоўваюцца зямельныя рэсурсы», — заключае ён.

Безумоўна, усе гэтыя кампетэнтныя выкладкі не змяншаюць апасенняў наконт лёсу ўнікальнага лесу Амазонкі. А перспектывы, мякка кажучы, зусім не радасныя. «Калі тэмпы знішчэння лясоў ва ўсёй Амазоніі, якія мы бачым сёння, захаваюцца, пераломны момант для ператварэння іх у саванну можа надысці ўжо на працягу 20-30 гадоў», — заявіў РІА «Навіны» бразільскі навуковец Карлас Нобрэ. Што да сёлетняй сітуацыі, то, як сцвярджаюць эксперты, вялікія пажары патушыць толькі працяглая залева. Канчаткова перамагчы агонь змогуць інтэнсіўныя ападкі, у той час як кароткатэрміновыя проста выпарацца. Сезон дажджоў у Амазоніі звычайна пачынаецца ў канцы верасня, і неабходна некалькі тыдняў, каб «вадзяны перыяд» перайшоў да актыўнай фазы. Па прагнозах, залевы не накрыюць усе падпаленыя раёны — некаторыя з іх, у прыватнасці на ўсходзе, застануцца сухія. Як перакананы эксперты, ападкі закрануць усе праблемныя ўчасткі лесу толькі ў кастрычніку. Такі вось расклад.

**Захар БУРАК.**

Міхаіл КЛІМІН:



# «Усход — справа тонкая. Адчуў на сабе»

## Як беларусы гуляюць у хакей у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах

**За сваю гульнявую кар'еру Міхаіл Клімін выступаў амаль за ўсе клубы беларускай экстралігі. Затым стаў самым маладым у гісторыі галоўным трэнерам, але пасля некалькіх гадоў работы на радзіме вырашыў паспрабаваць сябе ў больш экзатычным хакеі і адправіўся ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Там Міхаіл на працягу двух гадоў гуляў сам і трэніраваў не толькі дарослых, але і дзяцей. Пра тонкасці Усходу, экзатычны хакей, пра вяртанне ў Беларусь (цяпер спецыяліст працуе ў салігорскім «Шахцёры») і перамены ў айчынным хакеі ён расказаў у сваім інтэрв'ю.**

### «Ёсць шанц ператварыцца ў хакейную краіну»

***— Міхаіл, давайце пачнём з надзённага. Ужо два месяцы вы працуеце ў «Шахцёры», як трапілі ў гэты клуб?***

— Пасля таго як вырашыў з'ехаць з ААЭ, на мяне выйшаў Максім Трубіцын, прапанаваў папрацаваць трэнерам па развіцці ў фарм-клубе «Шахцёра». Я доўга не разважаў, прыляцеў і праз пару дзён прыехаў на перамовы, мяне ўсё задаволіла. Вельмі хутка ўліўся ў трэнерскі калектыў — мы думаем у адным кірунку. На цяперашні момант я шчаслівы, што знаходжуся на гэтым месцы. Сёння перад намі стаіць задача падрыхтаваць гульцоў для перадачы ў вышэйшае звяно — зборныя і першую каманду «Шахцёра».

***— Нядаўна ў нацыянальнай зборнай Беларусі з'явіўся новы галоўны трэнер, як вы адрэагавалі на такія перамены?***

— Асабіста я — «за», Міхаіла Захарава выбралі аднагалосна, гэта пра многае сведчыць. У маёй кар'еры сустракалася некалькі трэнераў, якія далі мне вельмі шмат у прафесіі, сярод іх — Міхаіл Міхайлавіч і Андрэй Сідарэнка. Яны падабралі мяне з вуліцы і далі пуцёўку ў жыццё, таму я быў і за аднаго, і за другога. Захараў — заслужаны трэнер нашай краіны, думаю, зараз сярод беларускіх спецыялістаў гэта аптымальны варыянт. Упэўнены, ён падбярэ сабе добры трэнерскі штаб. Як бы гучна гэта ні гучала, але, мне здаецца, менавіта ён адраджаў беларускі хакей раней, таму зможа зрабіць гэта і цяпер. Мне здаецца, станоўчая дынаміка сапраўды павінна быць. Балельшчыкі чакаюць выніку, не жадаюць цярпець, а спецыялісты кажуць, што трэба пачакаць. На самай справе, вядома, прабелы ў беларускім хакеі ёсць, але я ўсё ж такі думаю, што ў нас ёсць шанц ператварыцца ў хакейную краіну ў тым плане, каб трапіць у васьмёрку наймацнейшых у свеце і замацавацца там. Проста трэба закасаць рукавы і працаваць.

**«Калі на лёдзе іх моцна паганяць, заўтра можа палова каманды не прыйсці, сказаць, маўляў, у мяне справы, работа ці захварэў. Гэта раздражняла. Даводзілася ўжываць хітрыя метады, абыгрываць».**

***— Мінскае «Дынама» вось-вось пачне сезон, а на перадсезонных турнірах каманда паказала не самыя лепшыя вынікі.***

— Залежыць, з якога боку гэта разглядаць: калі з пазіцыі балельшчыка, то, так, выступілі няўдала. Але трэба памятаць, што сёлета «Дынама» пайшло па іншым шляху, яны хочуць працаваць у доўгатэрміновай перспектыве, а, значыць, хуткага выніку быць не можа. Вынік цяпер не ставіцца ў аснову.

### «У Эміратах я ўбачыў гультаёў»

***— Як у вашай кар'еры з'явіўся варыянт з Эміратамі?***

— Мне патэлефанавалі з Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, прапанавалі паспрабаваць папрацаваць у ААЭ. Паміж нашым Прэзідэнцкім клубам і іх федэрацыяй хакея падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Якраз быў вольны, англійскай мовай валодаю добра, да таго моманту ўжо папрацаваў у экстралізе і спрабаваў трэніраваць дзяцей. Праўда, гадоў пяць ужо не гуляў у хакей, але былых хакеістаў не бывае. Вядома, калі прыехаў, давялося старанна папрацаваць, каб набраць форму. Першы год адыгралі, на другі вырашылі, што для дасягнення мэт нам не хапае яшчэ двух трэнераў, таму прыцягнулі беларусаў Сяргея Задзялёнава і Арцёма Сінкевіча. І на другі год з іх дапамогай выканалі ўсе задачы: выйгралі Кубак Прэзідэнта, які яны ніколі не выйгравалі, першы ў гісторыі Кубак Кувейта, мясцовы чэмпіянат і прайшлі яго ўпершыню без адзінага паражэння, а са зборнай ААЭ ўпершыню ў гісторыі выйшлі на чэмпіянат свету ў 3-м дывізіёне.



***— Што для вас было самае дзіўнае ў арабскім хакеі?***

— Хакей усюды аднолькавы, узровень розны. Па-першае, Арабскія Эміраты займаюць 47-е месца з 50 у рэйтынгу IIHF, гэта значыць узровень падрыхтоўкі там вельмі слабы. Хоць ёсць пару добрых хлопцаў, якія ўмеюць катацца, кідаць, абыграць, але ў тактычным разуменні гульні, як мне казалі арабы, на ад'ездзе адтуль нашага Юрыя Файкова ўсё скончылася. Арабы з таго пакалення, дарэчы, маюць добры ўзровень — навучаныя, матываваныя, цікавыя. А вось потым ідзе велізарны 10-гадовы прабел — ні людзей, ні падрыхтоўкі. Калі мы прыехалі, узровень быццам бы зноў ссунуўся з мёртвай кропкі.

***— У хакей там гуляюць аматары?***

— Так, у арабаў няма работы ў нашым яе разуменні, усе яны займаюць высокія пасады, наогул іх усяго восем працэнтаў у краіне. Напрыклад, наш капітан каманды «Абу-Дабі Стормз» — гэта наш жа бос. Астатнія 92 працэнты замежнікаў у краіне працуюць на мясцовых. У хакей яны таксама гуляюць не за грошы, хоць некаторыя атрымліваюць зарплаты. У камандзе, у якой я гуляў, было ўсяго пяць легіянераў, астатнія — мясцовыя, але гэта ў асноўным старое пакаленне.

***— У чым заключаецца асноўная розніца паміж трэніроўкамі ў ААЭ і ў Беларусі?***

— У Эміратах я ўбачыў гультаёў. Калі сёння ты правеў трэніроўку на зямлі, яны трошкі стаміліся, то заўтра на трэніроўцы нікога не чакай, яны проста прыйдуць толькі да лёду, як ні ў чым не бывала. Або калі на лёдзе іх моцна паганяць, заўтра можа палова каманды не прыйсці, сказаць, маўляў, у мяне справы, работа ці захварэў. Гэта раздражняла. Даводзілася ўжываць хітрыя метады, абыгрываць. Калі мы іх і нагружалі, то хавалі гэта гульнявымі заданнямі, былі так званыя схаваныя бягі — яны гэтага не разумелі, але былі выціснутыя, як лімоны. Часам казалі, што заўтра пагуляем у хакей, яны прыходзілі ўсе, а мы зноў толькі трэніраваліся.

### «Хакей не супярэчыць іх рэлігіі»

***— Вы там не толькі былі гульцом, трэнерам у дарослай камандзе, а займаліся яшчэ і з дзецьмі?***

— Так, мы трэніравалі дзяцей ад самага першага набору да нацыянальнай зборнай, плюс яшчэ жаночая нацыянальная каманда. Даводзілася пісаць вельмі шмат планаў, думаць, які да каго падыход знайсці, бо трэба было падладзіцца пад кожны ўзровень. На лёдзе праводзілі да шасці гадзін у дзень, трэніраваліся чатыры дні на тыдзень. Было вельмі складана, хоць па сацыяльным сеціве некаторым здавалася, што мы там адпачывалі. На самай справе выхадныя сыходзілі на тое, каб падрыхтавацца да наступнага тыдня.

***— Арабскія дзеці чымсьці адрозніваюцца ад нашых у плане спорту?***

— Там жа шмат еўрапейцаў, таму дзеці таксама былі розныя — і фіны, і канадцы. Арабскіх дзяцей у асноўным на трэніроўкі прыводзілі няні, яны іх пераапранаюць, перад трэніроўкай кормяць, чаго, вядома, рабіць нельга. Натуральна, што ў такіх умовах дзеці таксама гультаі, але ўсе яны паслухмяныя, вельмі выхаваныя, з вялікай павагай ставяцца да старэйшых і да трэнера. Нашы дзеці ў параўнанні з усімі астатнімі больш заціснутыя.

***— Жаночы хакей у ААЭ таксама развіваецца?***

— Так, ёсць нават зборная краіны. Вельмі матываваныя, паслухмяныя, таварыскія, вясёлыя дзяўчаты. Хакей не супярэчыць іх рэлігіі. У Саудаўскай Аравіі таксама цяпер ствараецца жаночая каманда. Наверх на хіджаб яны надзяваюць шлем.

***— Як у ААЭ будуюцца каткі?***

— У славутым «Дубаі Моле» каток знаходзіцца на шостым паверсе. Ён прызначаны і для хакея, і для масавага катання. Таксама ў Абу-Дабі, хутчэй за ўсё, ужо ёсць вялікая арэна — яны планавалі яе будаваць. Іншае пытанне, навошта яны ім і хто там будзе трэніравацца? Летась у набор прыйшло 18 дзяцей, сёлета — 94. Для арабаў заняткі абсалютна бясплатныя. Але сёння яны прыйшлі, а заўтра сышлі, у іх хапае забаў і ім усё цікава, пакуль няцяжка.

***— Хадзілі чуткі, што каманда з ААЭ можа з'явіцца ў КХЛ...***

— Я не бачу арабаў у КХЛ. Якім чынам яны там будуць гуляць? Ні адзін з іх па ўзроўні не змог бы там выступаць, ім і самім гэта не трэба. Напрыклад, у нас быў добры хлопец, яму 19 гадоў, навучаўся ў Канадзе, у яго машына за 500 тысяч доляраў, багатыя бацькі і яму цяпер плечы там у КХЛ разнясуць. Навошта? Ён гуляе ў сваё задавальненне.

### «Паспрабаваў сябе на дне хакея, каб убачыць верх»

***— Замежнікі на хакеі ў Эміратах могуць зарабіць добрыя грошы?***

— Вядома, мы атрымлівалі там значна больш грошай, чым было б на гэты момант у Беларусі, хоць і ў нас раней былі добрыя часы. Аднак з сыходам Файкова легіянеры ў ААЭ сталі абясцэньвацца. Мы трапілі ўжо ў больш абрушаны рынак — яны не разумеюць, хто перад імі, якога ўзроўню легіянер. Напрыклад, глядзяць у пашпарт — калі чалавек фін, гэта для іх аўтаматычна значыць, што добры хакеіст, хоць ён можа быць і таксістам. Усход — справа тонкая. Адчуў на сабе.

***— Ці карыстаецца там хакей глядацкай папулярнасцю?***

— Больш за 100 чалавек на трыбунах сабраць складана, хоць, бывае, у «Дубаі моле», калі гульня цікавая, гэта атрымліваецца. Напрыклад, цікавыя гульні ў нас былі з камандай «Кэмэлс» — там вельмі шмат канадцаў, гуляюць яны вельмі брудна, таму мы называлі іх «пэцкалі», даводзілася іх увесь час трошкі дубасіць, шкло трашчала, людзей гэта прыцягвала. Арабы — людзі гарачыя.

***— Як яны ў цэлым ставяцца да спорту?***

— Любяць футбол, хакей, бокс. Спорт у іх, вядома, такі палавіністы, несапраўдны. А самае папулярнае ў ААЭ — джыу-джытсу.

***— Што далі вам гэтыя два гады ў плане трэнерскага вопыту?***

— На самай справе, многае. Я паразмаўляў з замежнымі спецыялістамі, даведаўся шмат цікавага, паспрабаваў сябе на дне хакея, каб убачыць верх. Акрамя таго, я хацеў паспрабаваць хакей на англійскай мове, і гэта ў мяне атрымалася.

***— Ці складана было прызвычаіцца да новай краіны ў бытавым плане і чаму ўсё ж такі вы вырашылі з'ехаць адтуль?***

— Нескладана, нас забяспечылі вялікім домам — усе беларусы жылі там, — машынамі. Гэта краіна першага свету, дзе ёсць усё. Так, існуе забарона на алкаголь, але ў іх ёсць крамы, дзе ты можаш яго купіць, прынесці ў чорным пакеце дадому і там выпіць. Праўда, перад гэтым табе трэба будзе ўзяць паперу ў свайго боса на рабоце, дзе ён напіша, колькі алкаголю ты можаш купляць. А так — краіна бяспечная, усе прыязныя, рухомыя, няма злых людзей, канфліктаў. Побач добрае мора, праўда, гарачае, асабліва ў ім не асвяжыцца. Чаму вырашыў вярнуцца? Я два гады быў у ААЭ без сям'і, гэта цяжка. Да таго ж мы крыху не сышліся па ўмовах, ну і, вядома, хочацца ў сапраўдны хакей.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



**Міхаіл КЛІМІН разам з Сяргеем ЗАДЗЯЛЁНАВЫМ *(першы злева)* і Арцёмам СІНКЕВІЧАМ *(чацвёрты злева)*.**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СтанкоГомель» (продавец) извещает о проведении 2 октября 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 9.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Номер лота – 1. Капитальное строение** с инвентарным номером 350/С-75612 (наименование: административное здание; назначение: здание административно-хозяйственное, материал стен – ж/б панели, кирпич), общей площадью 5762,7 кв. м, составные части и принадлежности: три забора (забор – длина 90,0 п. м – железобетонные плиты, забор – длина 6,00 п. м – железобетонные плиты, забор – длина 25 п. м – кирпичный), ворота – площадь 65,0 кв. м металлические на металлических столбах; комплектная трансформаторная подстанция КТП-1000 напряжением 10кВ с инвентарным номером № 4810, предназначенная для обслуживания капитального строения; внутриплощадочная тепловая сеть с инвентарным номером № 2242 протяженностью 16,0х2 м п.. Год постройки имущества – 1978 |
| **Дополнительно сообщаем:** ОАО «СтанкоГомель» заключен договор аренды № 53/148 от 01.01.2014 г. по 01.01.2020 г. с ППО ОАО «СтанкоГомель» «БЕЛПРОФМАШ». Предмет договора – части капитальных строений, которая представляет собой нежилые помещения площадью 28,13 кв. м в административно-хозяйственном здании (кадастровый номер № 2851); договор аренды 53/131 от 01.09.2008 г. по 01.09.2023 г. с УП по оказанию услуг А1. Предмет договора – часть капитального строения и часть кровли, которая представляет собой нежилое помещение площадью 13,2 кв. м |
| **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 10 |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003001502, площадью 0,1331 га |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 4 919 640,00 бел. руб.** |
| **Задаток (5 %) с учетом НДС: 245 982,00 бел. руб.** |

Продавец: ОАО «СтанкоГомель», г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. Контактный телефон +375 44 775 83 41.

**Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **продавца (ОАО «СтанкоГомель»): р/с BY28 AKBB30120363500253100000** в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», адрес банка: г. Гомель, пр-т Космонавтов, 32, БИК AKBBBY21302, УНП 400085002.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.09.2019 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи 60 %,оставшаяся сумма выплачивается Покупателем тремя равными долями ежемесячно, до 20 числа месяца, следующего за месяцем оплаты 60 %. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

**ООО «Гран-Консалт» – антикризисный управляющий в производстве по делу о банкротстве ЧТУП «АгроХимЛайф» (220036, Минская область, г. Заславль, ул. Дзержинская, д. 26, комн. 33, УНП 690639028), в отношении которого открыто ликвидационное производство, сообщает о проведении собрания кредиторов по защите требований кредитора: открытого акционерного общества «Белреахим», которое состоится 12.09.2019 в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 68, оф. 801. Ознакомиться с предъявленными требованиями кредитора и возражениями, выдвинутыми управляющим, возможно до проведения собрания, в рабочие дни с 10.00 до 15.00, по адресу: г. Минск ул. К. Либкнехта, д. 68, оф. 801, предварительно уведомив об этом управляющего по телефону – (017) 399-89-29**

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 10.10.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708014155, общей площадью 13,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тимошенко, 8-610. **Назначение: машино-место, наименование: машино-место № 610. Начальная цена продажи – 17 928,00 бел. руб., задаток — 1 792,80 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708138998, общей площадью 95,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 7А-4. Назначение: административное помещение, наименование: административное помещение. **Начальная цена продажи – 424 440,00 бел. руб., задаток — 42 444,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-27391, общей площадью 56,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Академика Красина, 91-1. Назначение: помещение транспортного назначения, наименование: гараж. **Начальная цена продажи – 6 390,00 бел. руб., задаток — 639,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-139273, общей площадью 363,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, д. Старое Село, ул. Центральная, д. 58. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Составные части и принадлежности: трехэтажный блочный жилой дом, состоящий из первого, второго и мансардного этажей, с цокольным этажом, 2014 г. п. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623687507101000067 площадью 0,2485 га. **Начальная цена продажи – 390 600,00 бел. руб., задаток — 39 060,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 642/С-27547, общей площадью 47,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Бобовнянский с/с, д. Рымаши, ул. Садовая, 16. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622880809601000067 площадью 0,2499 га. **Начальная цена продажи – 5 526,00 бел. руб., задаток — 552,60 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-71547, общей площадью 44,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 6/1-98, ГСПК «Карьер Ленинский». Назначение: помещение транспортного назначения, наименование: гараж. **Начальная цена продажи – 5 040,00 бел. руб., задаток — 504,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 123/С-23714, общей площадью 22,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, гаражный массив «Гидромаш-2» в районе ОАО «Гидромаш», гараж № 40. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: одноэтажный блочный гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 124350100001005528 площадью 0,9315 га. **Начальная цена продажи – 2 610,00 бел. руб., задаток — 261,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инвентарным номером 411/D-887, общей площадью 63,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Берестовицкий р-н, гп. Большая Берестовица, ул. Советская, 29-5. Назначение: квартира, наименование: квартира № 5. **Начальная цена продажи – 28 980,00 бел. руб., задаток — 2 898,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 330/D-40373, общей площадью 48,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Геологов, кв. 21, д. 1. Назначение: квартира, наименование: квартира № 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000008001072 площадью 0,0892. Имущественные права на земельный участок – право аренды, доля в праве 1/2. **Начальная цена продажи – 18 216,00 бел. руб., задаток — 1 821,60 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 310/С-6563, общей площадью 185,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, д. Телеши, ул. Набережная, 6А. Назначение: здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование: здание аптеки № 46. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321088007602000008 площадью 0,0832 га. **Начальная цена продажи – 5 400,00 бел. руб., задаток — 540,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 342/С-154186, общей площадью 56,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, гаражно-строительный потребительский кооператив «Светлогорск-Авиационная», 443. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж для хранения транспортных средств индивидуального пользования. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 325050100001002079 площадью 3,8618 га. **Начальная цена продажи – 11 250,00 бел. руб., задаток — 1 125,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 340/С-293529, общей площадью 15,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Красикова, 1Б/29. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324550100001000037 площадью 0,5238 га. **Начальная цена продажи – 2 610,00 бел. руб., задаток — 261,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

**Лот № 13.** Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-76636, общей площадью 46,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, пр-д Интернациональный, 17-51. Назначение: квартира, наименование: квартира № 51. **Начальная цена продажи – 49 410,00 бел. руб., задаток — 4 941,00 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.**

